ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 94 (3998)
ПАНЯДЗЕЛАК, 6 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Калгас „Сьвет“ ліквідуе „абязьлічаную“ язду

БАБРУЙСК. (Па тэлефоне).

Калгас «СЬВЕТ», адгукнуўшыся на адозву III усебеларускага зьезду калгасаў, шырока абмеркаваў даныя яму раёнам пасеўныя заданьні і высунуў сустрэчны плян.

Шырока таксама было абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы каня да вясны. Каб забясьпечыць рацыянальнае скарыстоўваньне конскай цягавай сілы і захаваць працаздольнасьць каня, калгасьнікі пастанавілі ліквідаваць «абязьлічаную» язду.

Кожны працаздольны калгасьнік прымацоўваецца да пары коняй. Магідаў.

Калгасьнікі арцелі „Вызваленьне жанчыны“

абвясьцілі прызыў ударнікаў другой калгаснай вясны

БОРША. (Па тэлеграфу ад наш. спэцкора). Агульны сход членаў калтасу «Вызваленьне жанчыны», Прандэцкага сельсавету, абмеркаваўшы новы закон аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку, вынес рэзалюцыю, у якой, між іншым, гаворыцца:

— Новы закон дае вялізарнейшыя ільготы калгасам, новыя вялікія магчымасьці для далейшага ўздыму калектывізацыі і забясьпечвае моцных другой бальшавіцкай вясны. Сход абавязваецца шырока папулярызаваць новы закон сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і серадняко́ў наўколь ных вёсак.

Сход пастанавіў зьвярнуцца з заклікам да ўсіх калгасьнікаў БССР арганізаваць усебеларускі прызыў ударнікаў другой калгаснай вясны.

5-ы ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

ГАНЕБНЫЯ ТЭМПЫ КАНТРАКТАЦЫІ—

вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці, адсутнасьці-масавасьці і дрэннай работы апарату

Зьдзельшчыну зрабіць асноўным вагаром барацьбы за выкананьне і перавыкананьне бальшавіцкай праграмы другой калгаснай вясны

МТС І САЎГАСЫ БССР ЯШЧЭ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЛІКВІДАЦЫІ „АБЯЗЬЛІЧАНАЙ“ ЯЗДЫ НА ТРАКТАРАХ

Агонь па кулаку, які спэкулюе на дробна-уласьніцкіх, інстынктах адсталых калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Разграміць праваапартуністычную агентуру кулака і яго „лявацкіх“ саюзьнікаў, якія бязьдзейнасьцю і адміністраваньнем дапамагаюць падрыўной рабоце клясавага ворага

Менск, 6 красавіка

Ход кантрактацыі яравых пасеваў выклікае самую **сур'ёзную трывогу.** Становішча, якое стварылася на гэтым важнейшым і рашаючым вучастку, зьяўляецца **пагражаючым.** Плян кантрактацыі яравых па БССР выканан толькі на 18,3 проц. **Ганебная лічба.** Лічба, якая сыгналізуе аб тым, што тістарычная адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі рэалізуецца **злачынна марудна.** Заключэньне кантрактацыйных дагавароў фактычна зусім **не разгорнута.** На сёнешні дзень мы маем нямала раёнаў, якія не закантрактавалі **ні аднаго** гэктара, дзе яшчэ не заключан **ні адзін** дагавор па кантрактацыі.

БССР — адзін з асноўных раёнаў тэхнічных культур Савецкага Саюзу. Аднак, кантрактацыя тэхкультур і асабліва ільну праходзіць зусім **нездавальняюча.**

Кантрактацыя тэхнічных культур — пад пагрозай зрыву. На сёнешні дзень не закантрактавана ні аднаго гэктара ільну. Прычына — праваапартуністычная стаўка на самацёк з боку раённых калгасна-каапэрацыйных органаў. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам ня даны (**НАРАЎЛЯНСКІ** раён).

Кантрактацыя тэхнічных культур пад пагрозай зрыву. Па ільне плян выканан усяго на 21 проц. Барацьба з кулацкім сабатажам не разгорнута. У раёне «не заўважылі» кулака. Кулацка-заможныя гаспадаркі не атрымалі цьвёрдых заданьняў (**КОХАНАЎСКІ** раён).

Такое становішча, як паказваюць матар'ялы генэральнай праверкі, характэрна ня толькі для Нараўлянскага і Коханаўскага раёнаў. І ў радзе іншых раёнаў барацьба за кантрактацыю яравых пасеваў падменена праваапартуністычнай стаўкай на самацёк. Корань праблемы ў кантрактацыі заключаецца іменна ў тым, што раённыя арганізацыі не вядуць патрэбнай барацьбы з праваапартуністычнай практыкай, што яшчэ ня зроблен бязьлітасны націск на кулака, што супраціўленьне кулацтва ў цэлым радзе раёнаў не атрымала належнага адпору.

Замест таго, каб шырока папулярызаваць адозву СНК і ЦК, каб давесьці яе да мас, каб заключаць кантрактацыйныя дагаворы пры самым актыўным і непасрэдным удзеле калгасьнікаў і аднаасобнікаў, кантрактуючыя арганізацыі ў многіх выпадках вядуць справу толькі з аднымі старшынямі калгасаў і сельсаветаў. **За такі бюрэкратызм, за такое адміністраваньне канкрэтных посьбітаў зла трэба караць бяз усякай літасьці.**

Матар'ялы з **Аршанскага** раёну, якія друкуюцца сёньня ў «Зьвязьдзе», сыгналізуюць аб злачынным «лявацкім» скажэньні дырэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі Тут замест таго, каб разгарнуць самую шырокую растлумачальную работу сярод калгасных і аднаасобных бяднякоў-серадняцкіх мас, каб мацней націснуць на кулака, знайшлі просты «выхад». У Аршанскім раёне ў нарадку загаду далі цьвёрдае заданьне па кантрактацыі ўсім бяднякоў-серадняцкім гаспадаркам. Гэта абураючая прова-«лявацкая» практыка аршанскіх апартуністаў павінна быць **неадкладна выпраўлена.** Усе канкрэтныя вінаватыя павінны быць неадкладна **адданы пад суд.** Аршанскіх «левакоў», якія кулаку па выгаду злачынна скажаюць дырэктывы партыі і ўраду, **трэба суровa і жорстка пакараць.** З гэтага факту ўсе раённыя арганізацыі павінны зрабіць палітычныя вывады.

Трэба разгарнуць самую бязьлітасную, самую суровую барацьбу з праваапартуністычнай практыкай і «лявацкімі» загібамі, трэба бяз усякай літасьці біць па кулацкай агентуры — правых і «левых» апартуністах, памаць супраціўленьне кулацтва.

Кулацка - заможныя гаспадаркі не кантрактуюцца. Ім дасюда цьвёрдыя заданьні. Трэба мацней націснуць на кулака, прымусіць яго выканаць гэтыя заданьні. Трэба аддаць пад суд усіх тых работнікаў, якія лібэральнічаюць з кулаком, якія глядзяць скрозь пальцы на невыкананьне кулацка-заможнымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў.

У абсалютнай большасьці раёнаў кантрактацыя праводзіцца толькі па лініі калгасаў. **Індывідуальны сэктар зусім выпаў з-пад увагі кантрактуючых арганізацый.** Гэта грубая і шкодная памылка. Трэба дабіцца неадкладнага і карэннага пералому ў разгортваньні кантрактацыі па аднаасобных бяднякоў-серадняцкіх гаспадарках. Трэба зараз-жа разгарнуць сярод аднаасобных бяднякоў-серадняцкіх мас самую шырокую работу. Трэба неадкладна скончыць заключэньне кантрактацыйных дагавароў ня толькі па калгасах, але і па індывідуальным сэктары.

Мы яшчэ раз рашуча ставім пытаньне аб тым, што НКЗ, Наркамснаб, цэнтры каапэрацыі і г. д. па-ранейшаму ня прымаюць досыць рашучых мер, каб забясьпечыць **зрух у кантрактацыі яравых пасеваў.**

ЦКК і органы Наркам'юсту павінны зрабіць патрэбныя арганізацыйныя вывады.

Цэнтральны камітэт УсеКП(б) у сваёй апошняй пастанове вызначыў цьвёрдыя тэрміны кантрактацыі:

«... тэрмін 15-га красавіка для сканчэньня кантрактацыі збожжавых культур і 5-га мая — для сканчэньня кантрактацыі ільну зьяўляецца канчатковым. Парушэньне гэтых тэрмінаў не павінна быць дапушчана ні ў якім разе».

Выкананем ка што-б там ні стала гэты баны загад партыі. Бязьлітасна змагаючыся з правымі і «левымі» апартуністамі, руйнуючы супраціўленьне кулацтва, на-бальшавіцку рэалізуем адозву ЦК і СНК аб кантрактацыі, арганізуем новы калгасны прыдыў. **БССР ПАВІННА У ТЭРМІН ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ ПАСЕВЫ.**

Усім нацыянальным ЦК, крайкомам, абкомам і райкомам УсеКП(б)

Пачатак сяўбы спазьняецца з прычыны кліматычных умоў. Тэрміны сяўбы ў параўнаньні з мінулым годам некалькі скарачаюцца. Гэта азначае, што для выкананьня пляну сяўбы патрабуецца значна лепшае, чым ў мінулым годзе выкарыстаньне ўсіх вытворчых магчымасьцяй, вялікая напружанасьць і арганізаванасьць работы.

Між тым, ЦК прымушан устанавіць, што дагэтуль яшчэ няма ў палёўнасьці раду неабходных умоў пасьпяховага праведзеньня сяўбы. Адсутнасьць-жа гэтых умоў тлумачыцца перш за ўсё тым, што парторганы не аддаюць вырашэньню гэтай задачы неабходных сіл і неабходнай увагі.

З усіх задач, стаячых перад партыйнымі арганізацыямі ў справе праведзеньня сяўбы, ЦК лічыць у сучасны момант рашаючымі задачы сканчэньня збору **насеньня і фуражных фондаў** калгасамі, праведзеньня зьдзельшчыны ў калгасах і саўгасах, **ліквідацыі абязьлічкі** ў адносінах выкарыстаньня трактараў і с.г. машын і завяршэньня работы па **кантрактацыі.**

1. Недапушчальна нядбайнай бязьдзейнасьці ў адносінах **збору насенных і фуражных фондаў** павінен быць пакладзен канец. Ва ўсіх выпадках недахвату насеньня і фуражу павінны быць мабілізаваны рэсурсы самі калгасьнікаў і са сродкаў новаўступіўшых у калгасы, якія, згодна неадпаразовым пастаноў Калгасцэнтру, пры ўступленьні павінны ўносіць сваю долю насенных і фуражных фондаў. Асабліва недапушчальны надзеі на самацёк і адсутнасьць сур'ёзнай работы ў справе збору фуражных фондаў у калгасах, без якіх ва ўмовах сучаснага спазьненьня вясны конь ня дасьць выкарыстаньня неабходнай максымальнай нагрузкі.

2. Работа па пераходзе калгасаў на зьдзельшчыну ўсё яшчэ нездавальняючая. Пастановы 6-га зьезду саветаў аб зьдзельшчыне ня ўсюды праводзяцца. Таксама невыстарчальна выкарыстаны для пераходу калгасаў на зьдзельшчыну зробленыя Наркамземам СССР і Калгасцэнтрам зьмены пунктаў 14 і 15 прыкладнага статуту с.-г. арцелі. Для таго, каб дабіцца неабходнай ва ўмовах позьняй вясны поўнага выкарыстаньня працы калгасьнікаў і цягавай сілы, трэба, каб пастановы 6-га зьезду саветаў былі сапраўды абмеркаваны ў кожным калгасе, аднаведныя зьмены ў статуце абмеркаваны і прыняты агульным сходам калгасьнікаў, нормы выпрацоўкі і расцэнкі розных работ у працаднёх распрацаваны, абмеркаваны і прыняты самымі калгасьнікамі. У аднаведнасьці з гэтым прапануецца ў пасеўнай зводцы забясьпечыць дакладны вучот ліку калгасаў, якія ўнесьлі ў свой статут аднаведныя зьмены пунктаў 14 і 15, а таксама ліку калгасаў, перайшоўшых на зьдзельную сыстэму працы.

3. Зусім неабходна да пачатку сяўбы скончыць **прымацаваньне трактарыстаў да трактараў.** На аснове пастановы Наркамзему СССР ад 23 сакавіка, апублікаванай у «Социалистическом Земледелии» № 85, з пункту гледжаньня захаваньня трактарнага парку і максымальнага яго выкарыстаньня ў веснавых работах гэтае прымацаваньне трактарыстаў іграе ня меншую ролю, чым ліквідацыя абязьлічкі на чыгунках.

4. Саўгасы вясной 1931 году павінны пасеяць ня менш 7,2 млн. гэкт. замест 3,1 млн. гэкт. вясной 1930 году. Гэта праграма ня будзе ажыцьцёўлена, **калі ў саўгасах усюды падзенная аплата працы ня будзе заменена зьдзельнай аплатай працы.** Ня гледзячы на неадпаразовыя распараджэньні па гэтым пытаньні Наркамзему СССР, у радзе саўгасаў наглядаюцца недапушчальныя хістаньні і сумненьні наконт увядзеньня зьдзельшчыны ў сельскай гаспадарцы. Калі ў калгасах пытаньне аб зьдзельшчыне стала асноўным з пункту гледжаньня арганізацыі працы, дык зусім нецярпімым зьяўляецца адставаньне ў гэтых адносінах саўгасаў. Саўгасы тут павінны паказаць прыклад. Трэба сыстэматычна праводзіць пераход і практыку ўжываньня зьдзельшчыны ў саўгасах.

5. Работа па кантрактацыі ідзе таксама нездавальняюча на ўсіх культурах, што пагражае ня толькі загатоўкам будучага году, але і выкананьню пляну веснавой сяўбы. Тэрмін 15 красавіка для сканчэньня кантрактацыі збожжавых і 5 мая—для сканчэньня кантрактацыі ільну зьяўляецца канчатковым. Парушэньне гэтых тэрмінаў не павінна быць дапушчана ні ў якім разе.

6. Выкананьню ўсіх гэтых задач, любач з задачамі падрыхтоўкі ўсяго с.-г. інвэнтару, конскага складу, рабочых плянаў у кожным калгасе, ЦК надае выключнае значэньне о пункту гледжаньня выкананьня праграмы сяўбы. У сувязі з гэтым ЦК прапануе ўсім нац. ЦК, крайкомам і абласным камітэтам паведамляць ЦК праз кожную дэкаду аб мерах, прынятых імі для выкананьня гэтай пастановы.

ЦК УсеКП(б).

Радыёграма ўсім раённым праверачным камісіям

Надаючы справе кантрактацыі выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне і ўлічваючы дрэнны ход гэтай работы ў большасьці раёнаў, прапануем раённай праверачнай камісіі неадкладна па тэлеграфе адказаць «Зьвязьдзе» на наступныя пытаньні:

1. Колькі закантрактавана (аформлена дагаварамі) ўсяго яравых на 5 красавіка. Асобна па калгасах і аднаасобным сэктары. Адказ паказаць па культурах у гэктарах і процант выкананьня.

2. Ці праводзіцца заключэньне кантрактацыйных дагавароў з адпаведным растлумачэньнем і ці разгорнута неабходная масавая работа. Адказ пацьвердзіць пэўнымі фактамі.

3. Якія формы прымае барацьба кулацтва супроць кантрактацыі

4. Наколькі пасьпяхова спраўляецца раённая арганізацыя з задачамі барацьбы з кулаком, за пасьпяховае праведзеньне кантрактацыі.

Разгарнеце сацспаборніцтва паміж паасобнымі сельсаветамі, уступайце ў сацспаборніцтва з іншымі раёнамі на хутчэйшае сканчэньне кантрактацыі.

Напамінаем, што 11 красавіка ўсе раённыя праверачныя камісіі пад адказнасьць сакратароў райкомаў партыі абавязаны па тэлеграфе даць чарговую тэлеграфную зводку «Зьвязьдзе» па ўстаноўленай схэме і адказаць таксама на ўсе пытаньні, якія датычаць кантрактацыі па становішчы на 10 красавіка.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.
Нам. НКЗ МАСЮКОЎ.
Нам. старшыні Калгасцэнтру СТРЭЛЕ.
Адказны рэдактар «Зьвязды» БУДЗІНСКІ.

БЮЛЕТЭНЬ № 4

5-га красавіка рэдакцыя «Зьвязды» атрымала тэлеграфныя зводкі аб уключэньні ў генэральную праверку яшчэ з 7 раёнаў. На сёнешні дзень у генэральную праверку падрыхтаванасьці да сяўбы ўжо ўключыліся 60 раёнаў. 28 раёнаў упарта ня выконваюць важнейшай дырэктывы партыі, чагосьці чакаюць. Вось гэтыя раёны.

Асьвейскі, Бабруйскі, Быхаўскі, Бялыніцкі, Буда-Кашалёўскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі, Высачанскі, Ветрынскі, Вушацкі, Горацкі, Глускі, Гомельскі, Дубровенскі, Жуpавіцкі, Койданаўскі, Коханаўскі, Круглянскі, Крупскі, Калінкавіцкі, Кармянскі, Касьцюковіцкі, Клімавіцкі, Лоеўскі, Любаньскі, Магілёўскі. Попашні. Прапойскі. Рагачоўскі, Рэчыцкі, Сенненскі, Тураўскі, Хапоеніцкі, Хоцімскі, Чавускі, Чашніцкі і Юравіцкі.

Гістарычная адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі яшчэ ня стала зброяй у руках раённых арганізацый для баявой падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны. У радзе раёнаў—Гарадоцкім, Буда-Кашалёўскім, Барысаўскім, Халопеніцкім, Аршанскім—работа па кантрактацыі зусім не разгорнута. Бяднякова-серадняцкія масы вёскі, калгасьнікі нічога ня ведаюць пра адозву партыі і ўраду. Масавая растлумачальная работа ў некаторых мясцох (Аршанскі раён) падмяняецца адміністраваньнем. Вясковая грамадзкасьць зусім ня прыцягнута да папулярызацыі адозвы партыі і ўраду сярод бяднякова-серадняцкіх мас вёскі.

Да выхаду ў поле—

падпісаць дагавары па кантрактацыі

Кожны калгасьнік, кожны бядняк і серадняк павінен ведаць пра ільготы кантрактантам

Набліжаюцца рашаючыя дні веснавой сяўбы. Дагавары па кантрактацыі павінны быць падпісаны ўжо да выхаду ў поле.

У гэтым годзе кантрактацыя праводзіцца ва ўмовах, якія даюць магчымасьць накіраваць у вёску значную колькасьць машын, трактараў і вытворчы крэдыт. Такім чынам пад кантрактацыю падводзіцца моцная матар'яльная база.

На сёнешні дзень вынікі кантрактацыі па БССР трэба прызнаць яўна незадавальняючымі. На 1-га красавіка плян кантрактацыі збожжавых культур выкананы у разьмеры 18 проц., па ільне—на 23 проц.

Асноўнай прычынай нездавальняючага ходу кантрактацыі зьяўляецца тое, што бядняцка-серадняцкія масы вёскі дагэтуль не азнаёмлены з адозвай ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі. Раённыя арганізацыі не разгарнулі масавай растлумачальнай работы вакол гэтай адозвы, не зрабілі яе зброяй далейшага разгортваньня калектывізацыі.

У некаторых раёнах, напрыклад, у Аршанскім і Магілёўскім, масавая растлумачальная работа падмяняецца грубым адміністраваньнем і скажэньнем дырэктыў партыі ў парадку праведзеньня кантрактацыі. У гэтых раёнах пляны па кантрактацыі даводзяцца да вёсак і бяднякова-серадняцкіх мас адміністрацыйным шляхам.

Пілнай растлумачальнай работы не вядзецца. У Магілёўскім раёне ў некаторых калгасах маса калгасьнікаў ня прымала ўдзелу ў абмеркаваньні дагавораў аб кантрактацыі. Апошнія абмяркоўваліся ў габінэтах праўленьняў бяз удзелу калгасных мас.

У некаторых раёнах, напрыклад, Гарадоцкім, мы наглядаем яўны апартунізм і недаацэнку значэньня кантрактацыі. Пралетарская грамадзкасьць раёну знаходзіцца ў баку ад мерапрыемстваў, якія праводзяцца партыяй па кантрактацыі, а таксама ад падрыхтоўкі да сяўбы. Ні камсамол, ні настаўніцтва, ні мясцовыя прафарганізацыі нічога не зрабілі, каб дапамагчы раённым арганізацыям рэалізаваць гістарычную адозву партыі і ўраду.

Раённыя арганізацыі павінны дабіцца рашучага перапому ў рабоце па кантрактацыі. Неабходна безадкладна разгарнуць шырокую масавую работу вакол адозвы ЦК і СНК. Кожны калгасьнік, кожны бядняк і серадняк—аднаасобнік павінен добра ведаць ільготы і перавагі, якія дае яму дагавор аб кантрактацыі свайх пасеваў. Гэта галоўнейшая задача раённых арганізацый.

Неабходна нанесьці руйнуючы ўдар кулацкім спробам сарваць кантрактацыю. Неабходна безадкладна давесьці цьвёрдыя заданьні па засеве да кулацкіх гаспадарак.

Партыйныя арганізацыі павінны ўзяць пад пільны кантроль выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па кантрактацыі з боку калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, трэба забясьпечыць усімі сіламі выкананьне пляну кантрактацыі ў вызначаныя тэрміны.

А. НЕЎСКІ.

У індывідуальным сэктары

не закантрактаваны ні адзін гэктар

БУДА-КАШАЛЁВА

У БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ раёне кантрактацыі не аддаецца амаль ніякай увагі. У радзе сельсаветаў, як ЗАБАБСКІ, ГУБІЦКІ І ЗАБАЛОЦКІ, нічога ня зроблена ў галіне кантрактацыі, не заключан ні адзін дагавор.

Раённыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня кантрактацыі і ня прымаюць належных мер да выкананьня гэтай важнейшай дырэктывы партыі. У індывідуальным сэктары раёну не закантрактаваны ні адзін гэктар.

С. Н.

У Халопенічах ігнаруюць дырэктыву партыі

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.). 26 сакавіка «Зьвязда» сыгналізавала аб прарывах у падрыхтоўцы да сяўбы ў Халопеніцкім раёне і асабліва ў галіне кантрактацыі. Ня гледзячы на гэта, справа з кантрактацыяй ня зрушылася з месца. **Плян выканан усяго ў разьмеры 26 проц.** Нават на такой культуры, як лён, якая зьяўляецца пераважнай для ільнаводчага раёну, плян кантрактацыі выкананы у разьмеры 45 проц. па калгасах і 19 проц. — па аднаасобным сэктары.

Канапель закантрактавана ўсяго 8 проц. пляну.

У некаторых сельсаветах, як, напрыклад, Чырвоналуцкім, да кантрактацыі нават і не прыступілі.

Раённыя арганізацыі вельмі марудна пераключаюцца на рэалізацыю гістарычнай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі.

Грубае парушэньне дырэктыў партыі

Адміністраваньне замест масавай работы

ВОРША, 5. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. СПЭЦКОРА).

У **РУДКОЎСКІМ** СЕЛЬСАВЕЦЕ, АРШАНСКАГА РАЁНУ ПАСЕЎНЫЯ І КАНТРАКТАЦЫЙНЫЯ ПЛЯНЫ ДАВОДЗЯЦЦА ДА ДВАРОЎ БЕЗ ПАПЯРЭДНЯЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ І АРГАНІЗАЦЫІ БЕДНАТЫ.

ГЭТЫМ КАРЫСТАЕЦЦА КУЛАК, ЯКІ ПАДБУХТОРВАЕ ПААСОБНЫХ НЕСЬВЯДОМЫХ БЕДНЯКОЎ ВЫСТУПАЦЬ НА АГУЛЬНЫХ СХОДАХ СУПРОЦЬ ПРЫНЯЦЬЦЯ ПЛЯНАЎ.

РАБОТНІКІ СЕЛЬСАВЕТУ, У ТЫМ ЛІКУ І ПРЫЕХАЎШЫЯ БРЫГАДЫ, ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ДАЦЬ АДПОР КУЛАЦТВУ І АРГАНІЗАВАЦЬ БЕДНАТУ, ІДУЦЬ ПА ЛІНІІ НАЙМЕНШАГА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЯ, **ДАВОДЗЯЧЫ ПЛЯНЫ ПАСЕЎКАМПАНІІ І КАНТРАКТАЦЫІ ПАРАДКУ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДА БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.**

У ПАРАДКУ ЗАГАДУ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ ДАВЕДЗЕНЫ ДА АДНААСОБНІКАЎ ЧАТЫРОХ ВЁСАК—ХАРКАЎКА, ЧЫГКАЎКА, ПАДЫЕНАЎКА І ЖЫТКАЎКА. ПЛЯНЫ КАНТРАКТАЦЫІ ТАКСАМА ДАВЕДЗЕНЫ Ў ПАРАДКУ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДА ГЭТЫХ 4-Х ВЁСАК.

ПА ЗАЯВЕ БРЫГАДЗІРАЎ, ТАКІ МЭТАД ДАВЯДЗЕНЬНЯ ПЛЯНАЎ ПАСЕВАЎ І КАНТРАКТАЦЫІ РЭКАМАНДАВАНЫ ІМ **ПРАДСТАЎНІКОМ БЕЛСАДСАЮЗУ ГОЛАСАВЫМ І СТАРШЫНЁЮ АРШАНСКАГА РАЙКААПСАЮЗУ МІКАНЧУКОМ.**

РК ПАРТЫЫ ПАВІНЕН НЕАДКЛАДНА ВЫПРАВІЦЬ ГЭТЫЯ АБУРАЮЧЫЯ ФАКТЫ АДМІНІСТРАВАНЬНЯ, ЯКІЯ НА РУКУ КУЛАКУ. НЕАБХОДНА ЖОРСТКА ЎДАРЫЦЬ ПА «ЛЕВЫХ» ЗАГІБІЧЫКАХ.

М. КІН.

З тыдні сельсавет без кіраўніцтва

Камсамол і настаўніцтва у баку ад бальшавіцкай вясны

ГАРАДОК. Кантрактацыя яравых і давядзеньне пляну веснавой сяўбы да двара праходзіць у раёне нездавальняюча. Прыкладам можа паслужыць **Бескатаўскі** сельсавет.

Па Бескатаўскім сельсавеце пляны сяўбы з 24 населішч даведзены толькі да 7-мі. Лён закантрактаваны толькі ў 3-х населішчах.

Асноўнай прычынай нездавальняючай работы ў падрыхтоўцы да сяўбы зьяўляецца тое, што **сельсавет стаіць у баку ад падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны.** Некаторыя члены сельсавету нават выступаюць супроць пляну кантрактацыі.

Сярод бяднякова-серадняцкіх гаспадарак і асабліва сярод жанчын не вядзец ніякай растлумачальнай работы. Гэта скарыстоўвае кулак для сваёй супроць калгаснай агітацыі.

Былы старшыня сельсавету Пятроў ныдаўна зьнят з работы за правы апартунізм. Новы старшыня Макараў у самы разгар падрыхтоўкі да сяўбы быў перакінут на другую работу. **На працягу 3-х тыдняў сельсавет заставаўся без кіраўніцтва.**

Пляны веснавой сяўбы складзены механічна, выходзячы толькі з процантных суадносін, ня ўлічваючы азімых пасеваў пааасобных гаспадарак. У выніку мы маем такія недарэчнасьці, калі на гаспадарку з 2,33 гэкт. пахаці на ярыну, паводле «пляну», прыпадае 0,06 гэкт.

Настаўніцтва і камсамол ня прымаюць удзелу ў падрыхтоўцы да сяўбы. Загадчык бескатаўскай школы, член сельсавету—Краснабір—на канферэнцыі настаўнікаў выступае з такімі заявамі—«што вам настаўнік казёл адпушчэньня, ці што?». Камэнтарыі да гэтага непатрэбны.

На тэрыторыі сельсавету знаходзіцца лесазапрацоўчы завод «Смалоўка». Члены партыі—рабочыя заводу—ахрамя сакратара партячэйкі, ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да сяўбы ня прымаюць.

Выкананьне пляну веснавой сяўбы і кантрактацыі (400 гэкт. ільну) патрабуе безадкладнай мабілізацыі ўсіх сіл сельсавету і грамадзкасьці. Бяз актыўнага ўдзелу камсамолу, настаўніцтва і саміх членаў сельсавету ня могуць быць праведзены важнейшыя дырэктывы партыі.

Брыгада асьпірантаў БАН
Іл. Барашка, П. Старасоцкая.

Сельсаветы і парт'ячэйкі

Мсьціслаўшчыны

У БАКУ ад КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Першыя дні праверкі па Мсьціслаўшчыне сьведчаць аб непадрыхтаванасьці раёну да сяўбы. У рабоце раённых арганізацый панує праваапартуністычны самацёк.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі і сельсаветы нічога не зрабілі, каб пасьпяхова разгарнуць падрыхтоўку калгасаў да сяўбы, каб арганізаваць на аснове замацаваньня калгасаў новы прыліў у калгасы.

У радзе калгасаў дагэтуль ня скончана размеркаваньне ўраджаю. Райкалгасаюз, які ведае пра гэта, дагэтуль ня прыняў ніякіх мер, каб дапамагчы калгасам.

У некаторых калгасах зрываецца аўчыстка насеньня з прычыны недахопу збожжа - аўчышчальных машын. Між тым, **на складах каапсаюзу пад замком ляжаць збожжа-аўчышчальныя машыны.**

Ганебны прарыў у падрыхтоўцы да сяўбы асабліва мае месца ў калгасе «Ударная праца» (вёска Пірагова, Татаршчэльскага сельсавету). У гэтым калгасе **яшчэ не абмалочана звыш 150 цэнтнэраў збожжа.** Сельска - гаспадарчы інвэнтар не адрамантаваны і ляжыць пад сьнегам, хлявы не ацеплены. Жывёла знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане, з прычыны адсутнасьці ўсякага догляду яе.

Мясцовая парт'ячэйка, якая ведае пра становішча ў калгасе, усё-ж такі нічога не зрабіла для аздараўленьня калгасу і дапамогі яму.

Некаторыя калгасы засьмечаны кулацкімі элемэнтамі. Прыкладам гэтага можа служыць калгас **«Расьцьвет»**, Шамоўскага сельсавету. У праўленьне гэтага калгасу праляза цэлая кулацкая сям'я: (брат, кум і дзядзька). Некаторыя партыйцы Шамоўскага сельсавету, як напрыклад **Аўчыньнікаў,** падтрымліваюць цесную сувязь з кулакамі і абараняюць іх.

Трэба ачысьціць Шамоўскі і Татаршчэльскі сельсаветы і парт'ячэйкі гэтых сельсаветаў ад правых апартуністаў, якія ня здолелі мабілізаваць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны, на разгортваньне калектывізацыі.

Т—ў.

Машыны—на складзе, угнаеньні—на станцыі

НАРОЎЛЯ. (Ад наш. спэцкор.).

На складзе райкаапсаюзу ляжыць сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару на **37 тыс. руб.** Тут і сяўлкі, бораны, сартоўкі і калёсы. Машыны і інвэнтар прыбываюць з кожным днём.

Аднак, гэтыя сродкі вытворчасьці, да зарэзу патрэбныя калгасам да сяўбы, не рэалізуюцца. Чаму? Адказаць ня можа ніхто з райкаапсаюзу і райкалгасаюзу.

Прычына простая: у Нароўлі ня ўжываюцца належныя меры, каб сродкі вытворчасьці прасунуць у калгасы. І райкаапсаюз і райкалгасаюз бязьдзейнічаюць, чакаючы пакуль калгасы самі прыедуць за машынамі. Ніякіх мер, каб мабілізаваць сродкі ў калгасах для пакупкі машын ня ўжываецца.

Абураючая бязьдзейнасьць ілюструецца наступнымі фактамі. Калгасы адчуваюць вялікі недахват калёс. Між тым, на складзе ляжаць 60 калёс. Ачыстка збожжа праходзіць нездавальняюча, а 15 збожжаачышчальных машын стаяць на дварэ складу. Тут-жа на складзе валяецца 180 парніковых рам, тым часам, калі яны павінны былі быць у калгасах, якія вырошчваюць раньнюю гародніну.

На станцыі Ельск ляжыць 20 вагонаў вапны. Ні адзін калгас пакуль ня думае прыяжджаць за вапнай, а санная дарога ўжо скора канчаецца.

Віну за затаварваньне машын райкаапсаюз звальвае на райкалгасаюз, апошні на калгасы, а справы ня відаць — дні сяўбы набліжаюцца.

П. Ч.

Сядзяць ля мора і чакаюць надвор'я

МАЗЫР.

На складах мазырскага жывёлагадоўчага райкаапсаюзу затаварылася сродкаў вытворчасьці да веснавой кампаніі на суму 95 тыс. руб., з якіх на 13.500 руб. — мінэральных угнаеньняў.

Райкаапсаюз, як відаць, мяркуе гэтыя залежы рэалізаваць пасьля веснавой сяўбы, бо да пачатку палявых работ засталіся лічаныя дні.

Нічога не робіцца, каб скарыстаць запалучаюць, якія дасягае 8а тыс. руб.

і лічыцца як за калгасамі, так і за рознымі іншымі ўстановамі і асобамі

Райкаапсаюз лічыць, што машыны не рэалізуюцца з тэй прычыны, што пры іх закупцы трэба шмат уносіць наяўнымі грашыма. Замест таго, каб разгарнуць работу па мабілізацыі сродкаў у калгасах, райкаапсаюз лічыць за лепшае ісьці па лініі найменшага супраціўленьня, г. зн. чакаць пакуль калгасы самі возьмуцца за гэту справу і тады прыедуць за машынамі.

З. З-н.

Метчанскі сельсавет выканаў плян кантрактацыі

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Плян кантрактацыі яравых выканан па раёне ўсяго ў разьмеры 10 проц. Гэта лічба фактычна выканана адным Метчанскім сельсаветам. **Метчанскі сельсавет свой плян кантрактацыі выканаў поўнасьцю.**

У іншых сельсаветах раёну нічога ня зроблена ў галіне кантрактацыі як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары.

Райкалгассаюз з вялікім спазьненьнем разаслаў на месцы дагавары кантрактацыі, што затрымала разгортваньне ўсёй работы.

Пад суд падкулачнікаў, якія зрываюць кантрактацыю

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Па Магілёўскім раёне плян кантрактацыі яравых выканан у разьмеры 34 проц.

У некаторых, сельсаветах, як, напрыклад, **Паньмавіцкім,** наглядаецца нават супраціўленьне мерапрыемствам партыі, як у галіне калектывізацыі, так і кантрактацыі. У сельсавеце няма ніводнага калгасу. Кантрактацыя і асноўныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да сяўбы ў сельсавеце зрываюцца. Тлумачыцца гэта тым, што на чале сельсавету знаходзяцца заможнікі і падкулачнікі. Старшыня сельсавету **Ганчарэнка** мае 20 гэктараў зямлі. Старшыня камітэту ўзаемадапамогі **Вальковў** мае 10 дзес. зямлі і актыўна вядзе барацьбу супроць калектывізацыі.

Пленум сельсавету над упытвам гэтых падкулачнікаў прыняў рэзалюцыю супроць калектывізацыі.

Ня дзіва, калі сельсавет адкрыта абараняе кулакоў. Кулахом нават ня даны цьвёрдыя заданьні.

Падкулачнікі, якія зрываюць важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўраду, павінны быць выкінуты з сельсавету і аддадзены пад суд.

Прымацаваньне да трактараў... на паперы

Пытаньні ліквідацыі «абязьлічанай» язды на трактарах яшчэ не пастаўлены ў цэнтры ўвагі сыстэмы Трактарацэнтру ў БССР і саўгасаў Белсельтросту і Сьвінавода.

Крывавыя пагромы на Зах. Беларусі і Зах. Украіне,

ТЫСЯЧЫ РАССТРЭЛЯНЫХ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ,

ператварэньне фашысцкіх казэматаў у „фабрыкі трупаў“—

вось шлях польскага фашызму ў падрыхтоўцы ўзброенага нападу на СССР

СУПРОЦЬ ПАГРОМАЎ ПОЛЬСКАЙ ПАЛІЦЭЙШЧЫНЫ, ПРЫ ДАПАМОЗЕ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТАЎ, НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ, СУПРОЦЬ СЯРЭДНЯВЯКОВЫХ КАТАВАНЬНЯЎ, НЯЧУВАНЫХ ГВАЛТАЎ І ЗЬДЗЕКАЎ

ПРАЦОЎНЫЯ БССР УЗЬНІМАЮЦЬ ГОЛАС ПРАТЭСТУ

У казэматах фашысцкае Польшчы

Палітычныя зьняволеныя турмы Вронкі, вядомай пад назвай «фабрыкі трупаў», падалі пракурорскаму нагляду запіску, у якой падаецца жудасны малюнак «жыцьця» (правільней, павольнай сьмерці) палітычных зьняволеных гэтай найбольш страшнай з польскіх турмаў. З часу прызначэньня ў Вронкі новага начальніка турмы Пашкевіча, і без таго надзвычай цяжкія ўмовы жыцьця палітзьняволеных зрабіліся зусім немагчымымі.

Зьняволеныя ўвесь прысуджаны тэрмін сядзяць у адзіночных камэрах, у якіх вокны зматавага шкла, якое не прапускае ні аднаго промня сонца. Камэра адначасова служыць і ўборнай. Харч дрэнны. Падзяліцца атрыманым з волі харчам нават з бліжэйшым таварышом забаронена. Прагулка працягваецца гадзіну, прычым прыходзіцца ўвесь час хадзіць. Нават хворым забаронена садзіцца або спыняцца. Для прагулак адведзены пасночны бок двара. У час прагулкі звычайна адбываецца ачыстка выгрэбных ям, якія знаходзяцца на тым-жа дваре. Мэдыцынская дапамога або зусім не аказваецца, або яна зьяўляецца толькі здзекам над годнасьцю чалавека. Доктар раіць, напрыклад, палітзьняволенаму падаць заяву, каб яго зьмясьцілі ў больніцу, бо знайшоў у яго парок сэрца, або сухоты, а турэмным і пракурорскім уладам той-жа доктар паведамляе, што хвароба нясур'ёзная, або што гэта сімуляцыя.

Дазвол на атрыманьне газэт абярнуўся ў фікцыю. Бо вырэзваюцца цэлыя старонкі, і нават з урадавых органаў друку выкрэсьліваецца на некалькі артыкулаў. З кніг дапускаюцца толькі польскія і то толькі белетрыстыка самага «бясшкоднага» зьместу. Выбар кніг залежыць ад жаданьня начальніка, які ліквідаваў бібліятэку палітзьняволеных, якая складалася з 600, пераважна навуковых кніг. Кнігі гэтыя — багацьце палітзьняволеных — канфіскаваны. З лістоў палітзьняволеных (ня больш 3-х у месяц) выкрэсьліваецца па жаданьні начальніка ўсё, што здаецца яму падазроным. На палітзьняволеных сыплюцца кары: карцар, пазбаўленьне перапіскі, газэт і кніг, — усё гэта за найменшае невыкананьне ўстаноўленых дражнаўскіх турэмных правіл.

Не на многа лепшае становішча ў катаржнай турме ў Равічах (Пазнанскае ваяводзтва).

У адкрытым лісьце да рабочых і сялян палітзьняволеныя гэтай турмы пішуць аб жудасных умовах, у якіх ім прыходзіцца адбываць тэрмін зьняволеньня, у большасьці доўгі. У гэтай турме сядзяць беларускія і украінскія сяляне, прыгаворваныя фашысцкім судом да 10, 15 і 20 год катаржнай турмы або да бестэрміновай катаргі. Турма ў Равічы — гэта масавая вытворчасьць трупаў. За час незалежнасьці Польшчы ў гэтай турме загінула 840 зьняволеных. На ўсе пратэсты супроць голаду, холаду ў камэрах, недапусканьня газэт, кніг, забароны бачыцца з сваякамі і г. д. начальнік турмы афіцэр Юнчыц цынічна адказвае, што гэта яшчэ добра, а будзе горш.

У жаночай катаржнай турме ў Фардзоне (Пазнанскае ваяводзтва) уведзены новы фашысцкі турэмны рэгламант. У сувязі з гэтым жанчыны палітзьняволеныя пазбаўлены ўсіх ранейшых правоў. Скарочаны час прагулак, прычым палітзьняволеным жанчынам дазволена гуляць толькі ўдваіх, забаронена закупка прадуктаў на агульныя сродкі, турэмная адміністрацыя не прызнае дэлегатак і інш. Акрамя таго, пад выглядам клапатлівасьці аб здароўі палітзьняволеных уведзен санітарны агляд, які ставіць жанчын палітзьняволеных у аднолькавыя ўмовы з прастытуткамі. У адказ на ўсе гэтыя прасьледваньні палітзьняволеныя жанчыны ў турме ў Фардзоне перасталі прымаць пасылкі, ня выходзяць на прагулку і інш.

Аб увядзеньні новага фашысцкага рэгляманту, які ставіць палітычных зьняволеных у аднолькавыя ўмовы з крымінальнымі злачынцамі, паведамляюць таксама з турмы ў Драгобычы (Заходняя Украіна).

У сувязі з увядзеньнем такога-ж рэгляманту ў Радамскай турме, палітычныя зьняволеныя абвясьцілі галадоўку, якая працягвалася 4 дні.

Аднак, гэта подлая помста паноў не зламала баявога духу барацьбітоў за рабочую справу. Пастаянныя галадоўкі і непарадкі ў турмах паказваюць, што палітзьняволеныя і тут вядуць барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць са сваім клясавым ворагам.

А. Г.

«27-га сакавіка ў Вільні адбыўся зьезд паспоў урадавай партыі з 4-х усходніх ваяводзтваў. Першым пытаньнем у парадку дня было вырашэньне ільняной праблемы ў Зах. Беларусі. На гэтым зьезьдзе з дакладам «Аб праграме ў справе беларускай» выступіў Р. Астроўскі («Газэта Польска»).»

Вырашэньне «ільняной праблемы» ў Заходняй Беларусі паводле плянаў беларускіх нацыянал-фашыстаў.

Рост уплываў КПЗБ сярод віленскіх рабочых

ВІЛЬНЯ, 5-га красавіка. Пілсудцкаўская газэта «Кур'ер Віленскі» друкуе артыкулы аб прафсаюзным руху на Віленшчыне. У артыкуле ад 3 красавіка газэта, гаворачы аб уплывах розных палітычных партый на віленскіх рабочых, прымушана прызнаць, што «камуністы ў Вільні зьяўляюцца, бадай, дамінуючай сілай у рабочых сфэрах». Адзначаючы вялікую раздробленасьць прафсаюзнага руху, газэта падкрэсьлівае, што ўвесь апошні перыяд «характарызаваўся наступаючай наперад кампаніяй разьбіцьця прафсаюзнага руху з боку ППС і роўнажэння з гэтым—адначасовым узростам арганізацыйных уплываў камуністычнай партыі».

«Кур'ер Віленскі» прымушан прызнаць, што «рэвалюцыйныя прафсаюзы здабываюць вялікую папулярнасьць сярод рабочых, змагаючыся пад лёзунгам аб'яднаньня прафсаюзнага руху і процідзеяньня раскольніцкай рабоце ППС».

На фоне гэтых прызнаньняў пілсудчыкаў, сакай газэты становіцца зразумелым, чаму фашысцкі ўрад ужывае такі асабліва жорсткі тэрор да левага прафсаюзнага руху ў Вільні. Як паведамляліся ўжо, амаль усе левыя прафсаюзы Вільні закрыты за апошні час акупантамі.

Выступленьне беспрацоўных у Баранавічах

ВІЛЬНЯ, 5-га красавіка. За апошнія два месяцы ў Баранавічах адбылося некалькі мітынгаў і дэманстрацый беспрацоўных. Беспрацоўныя дамагаюцца дзяржаўнай дапамогі. Баранавіцкі магістрат адмовіўся выдаць грашовую дапамогу беспрацоўным. Страшэнны голад і пэндзя пануюць сярод дваццацітысячнай арміі беспрацоўных Баранавіч.

Акупанты наступаюць на берасьцейскіх чыгуначнікаў

ВІЛЬНЯ, 6-га красавіка. У 5-ці чыгуначных дэпо Берасьця працуе ў даны момант 1.100 чалавек. Фашысцкі ўрад падрыхтоўвае рэдукцыю чыгуначных рабочых. Рэдукцыяй будуць ахоплены ў першую чаргу старыя рабочыя, у выніку чаго бяз працы і хлеба застаецца некалькі дзесяткаў чыгуначнікаў. Адначасова з рэдукцыяй ідзе наступленьне па заработную плату. З 1-га красавіка

Сяляне Берасьцейшчыны выступаюць супроць падаткаў і шарваркаў

ВІЛЬНЯ, 5-га красавіка. У апошні час адзначаецца актывізацыя барацьбы сялянскіх мас супроць падаткаў і так званых шарваркаў (прымусовая дармовая праца сялян на ваенныя патрэбы). У радзе раёнаў Берасьцеўскай акругі сяляне алмаўляюцца плаціць падаткі. Пашыраецца рух за алмаўленьне ад выкананьня шарваркаў. Напрыклад, у Тэраспольскім раёне адбылося 6 сходаў сялян, на якіх ухвалена ня выходзіць на шарваркі. Такія самыя пастановы прыняты на 4-х сходах Высока-Літоўскага раёну.

Антыпадатковая барацьба працоўных сялян разгортваецца пад лёзунгам КПЗБ — «ні гроша фашысцкаму ўраду —упаду голаду, беспрацоўя, тэрору і вайны».

Адстаўка румынскага ўраду

ВЕНА, 5. Паводле вестак з Бухарэста, урад Міранэску падаўся ўчора ў адстаўку. Асноўная прычына адстаўкі заключаецца ў імкненьні Караля стварыць габінэт «нацыянальнай канцэнтрацыі» з удзелам лібэралаў. Да гэтага Караля пабуджае наступленьне крызісу ў Румыніі і патрабаваньні замежных, у першую чаргу, францускіх крэдытораў.

Глушакевич. 5—5

Падрыхтоўка вял'зарнага палітычнага працэсу ў Японіі

ТОКІЁ. Асакская паліцыя скасавала распараджэньне, якое забараняла друкаваць паведамленьні аб арышце на працягу пютага-жніўня 1930 году 1.500 чал. Арыштаваныя абвінавачваюцца або ў прыналежнасьці або ў актыўнай дапамозе японскай кампартыі. 490 арыштаваных перадаюцца суду. Да іх будзе ўжыты «закон аб небясьпечных ідэях», які карае карай сьмерцю.

Хроніка белага тэрору ў Польшчы

(Верасень 1930 г.)

1 верасьня—налёт дэфэнзывы на выхаваўчы дом у Копе (Лодзінскае ваяводзтва), дзе на сродкі кадэцкапільнага саюзу ўтрымліваліся і навучаліся дзеці палітзьняволеных. Выхаваўчы дом быў ліквідаваны па працягу 24-х гадзін, а дзеці, наперакор волі іх бацькоў, ва ўзросьце ад 4 да 10 год дэфэнзывай былі адпраўлены ў каталіцкія выхаваўчыя дамы.

2 верасьня—палітычная паліцыя арыштавала ўсіх беларускіх дэпутатаў з пасольскага клюбу «Змаганьне»—Гаўрыліка, Крычынька і Валынца.

У Варшаве дэфэнзывай праведзены масавыя вобыскі і арышты. Арыштавана звыш 20 чалавек па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі.

У Львоўскім ваяводзтве дэфэнзывай праведзены масавыя вобыскі і арышты сярод украінцаў па падазрэньні ў прыналежнасьці да украінскай ваеннай арганізацыі.

5 верасьня—на распараджэньні львоўскага ваяводы Наканечнікава закрыт рад правінцыяльных аддзелаў украінскага добраахвотнага пажарнага і спартыўнага т-ваў, а таксама культурна-асьветнага т-ва «Просьвіта» ў Рава-Рускім павеце.

Пракуратура ў Лодзі выдала загад аб арышце дэпутата кампрацыі сойму тав. Росэка.

8 верасьня—разгон паліцыяй дэманстрацыі рабочай моладзі ў Вільні і арышты.

9 верасьня—у сувязі з расьпісаньнем новых выбараў у сойм і сэнат, у Вільні дэфэнзывай праведзены новыя масавыя вобыскі і арышты.

У Львове ў сувязі з падпалам трыбун на стадыёне гімнастычна-спартыўнага клюбу «Чарні» арыштавана 60 студэнтаў украінцаў.

10 верасьня—разгон дэманстрацыі рэвалюцыйнай моладзі ў Варшаве і крывавыя сутычкі з паліцыяй.

12 верасьня—арышт 6. дэпутатаў цэнтра-левай «апазыцыі».

Налёт паліцыі на варшаўскую канфэрэнцыю прафсаюзаў і арышт усёй канфэрэнцыі ў складзе 80 дэлегатаў.

Далейшыя масавыя вобыскі і арышты ў Варшаве.

За зьнікаў паліцыі жонка забітага пэпэсаўскай бойкай рабочага Віктара Белага прысуджана фашысцкім судом да аднаго месяца турмы.

14 верасьня—праведзены новыя арышты былых «апазыцыйных» дэпутатаў.

Па распараджэньні львоўскага ваяводы на заходня-украінскія вёскі накладзена кругавая парука, вёскі абавязаны дармова дастаўляць варту для ўсіх памешчыцкіх маёнткаў і хутароў.

14-16 верасьня—атака паліцыяй дэманстрацый цэнтра-левых партый. У рэзультаце ў Варшаве два забітыя, 18 параненых, у Катавіцах—20 параненых, Чэнстахове—15, Кракаве—13, Торуні—11, Остраве—5. Па ўсёй Польшчы арыштавана звыш 1.000 чалавек, прычым у адной толькі Варшаве арыштавала 300 чалавек.

21 верасьня—галадоўка палітзьняволеных у Краснастаўскай турме. Галадаючыя забарыкадаваліся. Выкліканая ў турму паліцыя пасьля бурных сутычак з забітымі галадаючых і саджае па карцарах.

24 верасьня—фашысцкай уладай у Польшчы пачата карная экспэдыцыя ў 4-х ваяводзтвах Зах. Украіны—Бабрэцкім, Рататынскім, Вжэснскім і Падгайскім. У масавай аблаве прымаюць удзел апарат войска спэцыяльна арганізаваныя атрады паліцыі.

26 верасьня—закрыцьцё ў Варшаве друкарань правых «апазыцыйных» газэт «АБЦ» і «Вечур Варшавскі».

27 верасьня—любліньскі акруговы суд прыгаварыў да кары сьмерцю 3-х рабочых—Сасноўца, Нябескага і Кагана па абвінавачаньні ў забойстве правакатара Сяллята.

28 верасьня—працэс рабочай моладзі ў Варшаве. Палісудны Быцкоўскі прыгаворан да 1 году катаргі і Алёбастар—на 2 гады катаргі.

У Роўне арыштаваны 21 рабочы—члены прафсаюзаў.

29 верасьня—галадоўка палітзьняволеных у Беластоцкай турме.

У Варшаве ў саюзе сацыялістычнай моладзі «Паходня» паліцыяй зроблен вобыск. Арыштаваны 4 чал.

У дараганбыскім павеце закрыта 11 бібліятэк украінскага культурна-асьветнага таварыства «Просьвіта».

30 верасьня—закрыты дзьве украінскія гімназіі—у Тарнопалі і Рагатыне.

У Львове арыштавана звыш 40 украінскіх студэнтаў.

***

Трэба адзначыць, што гэта хроніка фашысцкага тэрору ў Польшчы за верасень далёка няпоўная. Тут паданы толькі факты тэрору, якія былі зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» за верасень. Выпад ні крывавых распраў польскага фашызму над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны ў верасьні зьяўляюцца толькі кропляю ў моры таго фашысцкага разгулу, які панаваў у гэты час, асабліва на акупаванай Зах. Украіне і Зах. Беларусі. Так, факты фашысцкага тэрору ў адной толькі Заходняй Украіне складаюць цэлыя тамы.

Рэзалюцыя пратэсту пісьменьнікаў БССР супроць крывавага фашысцкага тэрору ў Зах. Беларусі

Фашысцкая Польшча, ажыцьцяўляючы пляны сусьветнага імпэрыялізму, сёньня зноў адкрыта працягвае сваю агідную лапу на Савецкі Саюз, рыхтуе вайну супроць першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Польскі фашызм разам са сваімі саюзьнікамі — заходня-беларускімі і заходня-украінскімі нацыянал - фашыстамі—вядуць лютую барацьбу з нацыянальна-вызвалеўчым рэвалюцыйным рухам, учыняюць пагромы рабоча-сялянскіх рэвалюцыйных і культурных арганізацый і ўстаноў, імкнуцца стварыць з Заходняй Беларусі і Зах. Украіны плацдарм для нападу імпэрыялістаў на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту—Савецкі Саюз.

Рабочая кляса і працоўныя масы Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, пад сьцягамі КПП, КПЗБ і КПЗУ, вядуць упартую барацьбу супроць польскага фашызму, які прывёў краіну да поўнага заняпаду. Яны ўсё больш пераконваюцца, што адзіным выйсьцем з нячуванага прыгнёту, беспрацоўя і галечы мас, прасьледаваньня і натаваньняў рэвалюцыянэраў і барацьбітоў за сапраўдны нацыянальна-вызвалеўчы рух — ёсьць шлях, па якім камуністычная партыя вядзе народы Савецкага Саюзу.

Польскі фашызм карыстаецца ўсімі сродкамі для сваёй барацьбы з Савецкім Саюзам. Правакацыйн, брахнёй па адрасе нашага сацыялістычнага будаўніцтва, хлусьнёю аб «прымусовай працы» ў Савецкім Саюзе, выдумкамі аб нацыянальным уціску, маной аб савецкім «дэмпінгу»—польскія фашысты рыхтуюць глебу для інтэрвэнцыі.

Белы тэрор Польшчы, разгром ППС-пявіцы, Беларускага работніцка-сялянскага пасольскага клюбу «Змаганьне», Таварыства беларускіх школ, арышт Тарашкевіча, прыдушэньне беларускай радыкальнай прэсы, пагромы на Зах. Украіне і Зах. Беларусі, распальваньне нацыянальнай розьні сярод зьняволеных фашысцкіх турмаў «Лукішкі», «Берасьце», «Горадня», «Белосток»—усё гэта гаворыць аб дзікай палітыцы разьюшанага польскага фашызму ў адносінах да працоўных нацыянальных меншасьцяй Польшчы. У гэтым ім старанна дапамагаюць беларускія і заходня-украінскія сацыял- і нацыянал-фашысты. Апошнія выступленьні беларускіх нацыянал-фашыстаў Зах. Беларусі разам з прадстаўнікамі польскага імпэрыялізму і дэфэнзывы (Жэлігоўскі, Кіртыкліс, Віслаух і інш.), блёк заходня-украінскай буржуазіі і кулацтва (Ундо) з польскім генэральным штабам, нагная правакацыйная антысавецкая кампанія фашысцкага польскага і беларускага друку з мэтай адурманьваньня працоўных мас Польшчы і Зах. Беларусі—усё гэта гаворыць аб сапраўдных мэтах ініцыятараў крывавай бойні.

МЫ, ПІСЬМЕНЬНІКІ БССР, добра ведаем гэтыя мэты польскага імпэрыялізму і яго верных пёкаяў—беларускіх нацыянал-фашыстаў. МЫ РАШУЧА ПРАТЭСТУЕМ СУПРОЦЬ ПАЛІТЫКІ ДЗІКАГА БЕЛАГА ТЭРОРУ; СУПРОЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ ВАЙНЫ ПОЛЬСКІМІ ІМПЭРЫЯЛІСТАМІ, СУПРОЦЬ НЯЧУВАНАГА ЦІСКУ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЎ У ПОЛЬШЧЫ, СУПРОЦЬ ПАГРОМАЎ НА ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЕ, СУПРОЦЬ БРУДНЫХ ПРАВАКАТАРСКІХ ІНСІНУАЦЫЙ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТАЎ НА СПРАВУ НАЦЫЯНАЛЬНА - КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР.

Мы рашуча пратэстуем супроць нахабнай інфармацыі фашысцкай беларускай прэсы аб нібы-та жахлівых умовах жыцьця і творчай працы беларускіх савецкіх пісьменьнікаў. Мы заяўляем, ШТО ТОЛЬКІ ВА ЎМОВАХ, ЯКІЯ СТВОРАНЫ САВЕЦКАЙ УЛАДАЙ, ДЗЯКУЮЧЫ ПРАВІЛЬНАМУ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ЗДОЛЕЛА СТАЦЬ У АДНУ ШАРЭНГУ З ЛІТАРАТУРАМІ ПЕРАДАВЫХ НАРОДАЎ СССР.

Мы заклікаем усіх пісьменьнікаў Савецкага Саюзу і пралетарскіх і рэвалюцыйных пісьменьнікаў усяго сьвету дапучыць свой голас пратэсту супроць падбухторшчыкаў новай бойні.

Мы заклікаем усіх пісьменьнікаў і дзеячоў Беларускай рэспублікі яшчэ шчыльней згуртавацца вакол штабу Вялікага Кастрычніка — Ленінскай камуністычнай партыі і сваёй творчасьцю ўзмацняць абароназдольнасьць краіны Саветаў.

Актыўны ўдзел пісьменьнікаў у сацыялістычным будаўніцтве зьяўляецца лепшым адказам ворагам пралетарыяту.

Да культурных дзеячоў Зах. Беларусі, якія на справе змагаюцца з польскім імпэрыялізмам, мы зварачаемся з заклікам: ШЧЫЛЬНЕЙ СВАЕ РАДЫ ВАКОЛ АДЗІНАГА БАРАЦЬБІТА ЗА ЛЕПШУЮ БУДУЧЫНЮ ЧАЛАВЕЦТВА — КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

Ганьба і сьмерць правакатарам і падпальшчыкам новых крывавых войнаў.

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне ў краінах капіталу!

Няхай жыве арганізатар сусьветнага Кастрычніка Камітэрн і яго сэкцыі!

Няхай жыве ўсесаюзная камуністычная партыя бальшавікоў — арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы!

ЯКУБ КОЛАС, П. ГАЛАВАЧ, Р. МУРАШКА, ЦІШКА ГАРТНЫ, С. ЗНАЕМЫ, С. БАРАНАВЫХ, КУЗЬМА ЧОРНЫ, А. САДАГУБ, З. БЯДУЛЯ, В. СТАШЭЎСКІ, С. БАРКОЎСКІ, М. ЗАРЭЦКІ, А. ЯКІМОВІЧ, КРАПІВА, В. СЭРБЭНТА, М. ЎЛЫНЬКОЎ, ІЛ. БАРАШКА, Я. ЛІМАНОЎСКІ, П. БРОЎКА, О. КАНАКОЦІН, ЮР. ЛЯВОННЫ, Е. ГАЛЬПЕРЫНА, Т. КЛЯШТОРНЫ, ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ, МІКУЛІЧ, А. ПАЛЬЧЭЎСКІ, ЦІМОХ ЗАРЭЧНЫ, С. КУНІЦКІ, ЗАМБЖЫЦКІ, МІКОЛА НІКАНОВІЧ, С. ШУШКЕВІЧ, МАКСІМ ЛУЖАНІН, УЛАДЗІМЕР ХАДЫКА, А. ВОЛЬНЫ, У. СЯДУРА, М. ЧАРОТ, Л. БЭНДА, В. КАВАЛЬ, АЛ. КУЧАР, ЮЛІ ТАЎБІН, АРК. КУЛЯШОЎ, ЗЬМ. АСТАПЕНКА, МІК. АЛЯХНОВІЧ.

РАУНЯЦЦА ПА „БАЛЬШАВІКУ“!

10-цігадовы юбілей парткалектыву чырвонасьцяжнага гарбарня „Бальшавік“ адзначае датэрміновым выкананьнем прамфінпляну за першы квартал

Змагаючыся за генэральную лінію партыі, выкарчоўваючы апартуністычную практыку, парткалектыў забясьпечыў свайму заводу адно з першых месц сярод буйнейшых прадпрыемстваў БССР

Аднаму з лепшых атрадаў КП(б) Беларусі--парткалектыву чырвонасьцяжнага скурзаводу „Бальшавік“

ЦК КП(б)Б ВІТАЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ, ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ І ЎВЕСЬ РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ ЗАВОДУ З ДАСЯГНУТЫМІ ПОСЬПЕХАМІ НА ФРОНЦЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ ДА ДНЯ СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ ІСНАВАНЬНЯ ПАРТАРГАНІЗАЦІІ ЗАВОДУ.

ГАРАЧАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ЎСТУПАЮЧАМУ Ў РАДЫ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ Ў ДЗЕНЬ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ЮБІЛЕЮ ПОВАМУ АТРАДУ ПРАЛЕТАРАЎ ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК».

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УПЭЎНЕН, ШТО ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК» ЗДОЛЕЕ АЎЛАДАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ І Ў ДАЛЕЙШАЙ СВАЕЙ РАБОЦЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ СВАЮ БАРАЦЬБУ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПА-ЛЕНІНСКУ ГЭНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, БЯЗЛІТАСНА ЗМАГАЮЧЫСЯ ЯК СУПРОЦЬ ПРАВАГА ЎХІЛУ, ЯКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ, ТАК І СУПРОЦЬ «ЛЯВАЦКІХ» ЗАГІБАЎ І ПРЫМІРЭНЦТВА ДА ІХ.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

„Па праве вам належыць пераходны сьцяг ЦСПСБ“ — Рабочым і адм.-тэх. персаналу гарбарні „Бальшавік“

Сьвяткаваньне дзесяцігадовага юбілею партыйнай арганізацыі вашага заводу адзначаецца новай перамогай на фронце выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва—перавыкананьнем прамфінпляну вашым заводам за першы квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Прыношу вам, таварышы, вітаньне з юбілеем партыйнай арганізацыі заводу і з новай перамогай. Па праве вам належыць пераходны сьцяг ЦСПСБ.

Трымайце яго і ў далейшым шляхам упорнага выкананьня прамфінпляну, паказвайце прыклад другім.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Слова новага папаўненьня ленінскай партыі

Мы ўступаем у партыю ў той момант, калі рабочая кляса і лепшая частка працоўнага сялянства — калгаснікі напружаюць усе свае сілы на тое, каб пад кіраўніцтвам сваёй камуністычнай партыі завяршыць у гэтым годзе пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Уяўляючы ўсю складанасьць задач, якія стаяць перад партыяй, і неабходнасьць мабілізацыі ўсіх членаў партыі для іх вырашэньня, мы бярэм на сябе абавязацельства:

1) Ва ўдарным парадку прайсьці школу партасьветы, каб на аснове ўзбраеньня сябе тэорыяй марксызму-ленінізму здолець па-бальшавіцку ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

2) Узняцца за вывучэньне тэхнікі вытворства, каб, аўладаўшы ёю, здолець весьці штодзённую барацьбу за рацыяналізацыю вытворства, паляпшэньне якасьці прадукцыі і падняцьце прадукцыйнасьці працы.

3) Узмацніць сваю штодзённую барацьбу за пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі і стаць узорам для астатніх ударнікаў заводу, як і належыць членам ленінскай партыі.

4) На аснове растлумачэньня рабочым правільнасьці генэральнай лініі партыі і неабходнасьці папаўненьня яе радоў за лік лепшых рабочых—весьці штодзённую вярбоўку лепшых ударнікаў у рады партыі.

Мы ўступаем у партыю у той момант, калі наш парткалектыў сьвяткуе 10-годзьдзе свайго слаўнага існаваньня, а завод атрымлівае пераходны Чырвоны Сьцяг імя ЦСПСБ.

Усёй сваёй далейшай работай мы будзем змагацца за працяг бальшавіцкіх традыцый нашага парткалектыву і за замацаваньне за заводам пераходнага Чырвонага Сьцягу імя ЦСПСБ.

(39 подпісаў).

Прывітаньне змаганьню за бальшавіцкія тэмпы працы

Прэзыдыум ЦВК БССР у сувязі з 10-годзьдзем існаваньня чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» вітае рабочых, адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі гарбарні з гэраічнай перамогай на фронце барацьбы за сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і датэрміновае выкананьне прамфінпляну першага кварталу.

Гэта перамога была дасягнута дзякуючы правільнай ленінскай генэральнай лініі партыі і савецкай улады і шырокаму ўдзелу рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, якія ўключыліся ў новыя формы сацыялістычнага змаганьня — сацспаборніцтва і ўдарніцтва — і гэтым самым узьнялі шырокія колы рабочае клясы на нячуваны ўзровень сацыялістычнай творчасьці і рабочага гэраізму.

На падставе гэраічных посьпехаў рабочых гарбарні «Бальшавік» усе рабочыя Беларусі, змагаючыся за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, прыкладуць усе сілы і пад кіраўніцтвам партыі і ўраду яшчэ з большай упэўненасьцю пойдуць наперад у баі за пабудову сацыялізму ў нашай краіне.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Віншуем з дасягнутымі посьпехамі

ВСНГ БССР горача вітае партарганізацыю заводу і ўвесь рабочы калектыў у дзень 10-гадзьдзя юбілею партарганізацыі заводу і віншуе з дасягнутымі посьпехамі на фронце барацьбы за сацыялізм і пасьпяховым выкананьнем прамфінпляну за асобны квартал і першы квартал 1931 г. і атрыманьнем пераходнага чырвонага сьцягу ЦСПСБ.

ВСНГ выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што баявы атрад—рабочы калектыў «Бальшавіка»—ударная работай дасягне далейшых посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Бальшавіцкія тэмпамі работы наносячы руйнуючыя ўдары клясаваму ворагу і яго агентуры—на змаганьне за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Старшыня ВСНГ БССР Грысевіч.

***

У сувязі з 10-гадзьдзем парткалектыву гарбарні «Бальшавік» таксама атрыманы прывітаньні ад прэзыдыуму ЦСПСБ, ЦП саюзу гарбароў, ЦК ЛКСМ і ад парткалектыву чырвонасьцяжнай фабрыкі «Кастрычнік».

***

«ЗЬВЯЗДА» ШЛЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, РАБОЧЫМ І ТЭХПЭРСАНАЛУ «БАЛЬШАВІКА», ПАКАЗАЎШЫМ ПРЫКЛАД УЗОРНАЙ РАБОТЫ Ў ВЫКАНАНЬНЯ ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАЧ.

БАЛЬШАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ПОСЬПЕХІ

Сёньня парткалектыў МЕНСКАГА ЧЫРВОНАШТАНДАРНАГА СКУРЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК» сьвяткуе 10-гадовы юбілей свайго існаваньня.

Гісторыя стварэньня і разьвіцьця заводу «Бальшавік» зьяўляецца адным з многіх ілюстрацый правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі і не ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У прыгнечанай раней царызмам Беларусі з былых маленькіх саматужных майстэрань, з прымітыўным абсталяваньнем і барбарскі цяжкімі ўмовамі працы, на аснове самаадданай барацьбы рабочага калектыву, пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, вырас магутны завод з высокім тэхнічным абсталяваньнем, з вялізнымі паляпшэньнямі працэсаў вытворчасьці, са значным паляпшэньнем працоўных умоў.

Такое пасьпяховае разгортваньне заводу ёсьць ПРОСТЫ РЭЗУЛЬТАТ ПАСЬЛЯДОЎНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў ЖЫЦЬЦЁ ГЭНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, накіраванай на скарыстаньне ўсіх магчымасьцяй гіганцкага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва на аснове творчага энтузіязму найшырэйшых мас рабочай клясы і бядняцка-сярэдняцкага сялянства СССР.

Магутнае разгортваньне заводу зьяўляецца ПРОСТЫМ РЭЗУЛЬТАТАМ ПРА ВІЛЬНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ НАШАЙ ПАРТЫЙЙ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, накіраванай на ўсямернае падтрыманьне з боку брацкіх рэспублік Савецкага Саюзу больш адстаўшай у эканамічных адносінах БССР.

Рабочы калектыў заводу «Бальшавік» за 10 з лішкам год існаваньня самаадданна змагаўся за замацаваньне і далейшае разгортваньне заваяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вялікіх посьпехаў рабочы калектыў дасягнуў толькі дзякуючы таму, што ён, пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, ажыцьцяўляў генэральную лінію партыі, рашуча змагаючыся супроць апартунізму ў розных яго праявах.

Са свайго асяродзішча рабочы калектыў заводу перадаў у рады партыі Леніна перадавых, самых стойкіх, вытрыманых таварышоў. Уцягваючы ў свае рады ўсё лепшае, што ёсьць у рабочай масе, партарганізацыя за ўвесь год свайго існаваньня вырасла з маленькай ячэйкі — трох чалавек — у магутны парткалектыў у 223 чалавекі. Ад

„У НАС ЁСЬЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ,

каб выканаць плян трэцяга рашаючага году пяцігодкі,—

ДЫК ПАКАЖАМ-ЖА, ШТО МЫ ЎМЕЕМ ВЫКАРЫСТАЦЬ ГЭТЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ"

Прымем выклік рабочых тульскага заводу № 1.—Адзначым другую гадавіну сацспаборніцтва наборам новых тысяч ударнікаў імя 518 і 1040 —барацьбітоў за пяцігодку за чатыры гады, распачнем баявую кампанію за сустрэчныя пляны норм выпрацоўкі

Задача партыйных і прафсаюзных арганізацый—разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол адозвы тульскіх рабочых, стаць на чале актыўнасьці і ініцыятывы рабочых мас за ўзьняцьце сацспаборніцтва на вышэйшую ступень, за арганізацыю сустрэчных пляноў норм выпрацоўкі

Заклік тульскіх рабочых давесьці да кожнага рабочага

Сацыялістычныя формы працы ўсё шырэй і шырэй ахапляюць новыя колы рабочых, саўгасьнікаў і калгасьнікаў. Ленінская ідэя сацыялістычнага спаборніцтва ўсё глыбей і глыбей прасякае ў нетры працоўных мас. На працягу двух год шырокай хваляй разгортваецца спаборніцтва па нашых заводах і фабрыках, калгасах і саўгасах. Па 29 прадпрыемствах БССР па 1 ступеня было ахоплена спаборніцтвам 70 проц. рабочых.

Мэтадам спаборніцтва ажыцьцяўляюцца пляны сацыялістычнага будаўніцтва на кожным вучастку разгорнутага фронту. Ударныя «сквозныя» брыгады, грамадзкія буксіры, сустрэчныя пляны — вось галоўныя вышэйшыя формы сацыялістычнай працы.

Рабочыя, саўгасьнікі і калгасьнікі, разумоючы сусьветна-гістарычнае значэньне выкананьня лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады» праз сацыялістычнае спаборніцтва змагаюцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за поўнае ажыцьцяўленьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Аднак, ня ўсюды яшчэ праводзіцца выстарчальная работа з боку мясцовых арганізацый па разгортваньні і ўзначаленьні ўдарніцтва і спаборніцтва. Слаба разгорнута сацспаборніцтва паміж новымі рабочымі, новымі саўгасьнікамі і калгасьнікамі, на транспарце.

Адозва рабочых **тульскага заводу № 1**, якая зьмяшчаецца ў сёньнішнім нумары **«Зьвязды»**, мае вялікую палітычную важнасьць. Няма сумненьня, што гэта адозва спаткае жывы водгук сярод працоўных мас БССР. Вялізарныя дасягненьні, якія мае наша краіна, павінны быць даведзены да кожнага рабочага.

БССР ператвараецца ў краіну перадавую, індустрыяльна-аграрную. Досыць прывесьці такія перамогі па фронце сацыялістычнага будаўніцтва, як адкрыцьцё Асінбуду, бабруйскага дрэва-апрацоўчага камбінату, Гомсельмашу, Магвалакнабуду, 24 машына-трактарных станцый, каб бачыць, як карэнным чынам мяняе твар БССР. Гэтыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва выклікаюць яшчэ больш ўзьнім творчага энтузіязму рабочых. І таму выкананьне першага пункту прапановы рабочых тульскага заводу № 1 аб давядзеньні да кожнага рабочага посьпехаў нашага будаўніцтва стымулюе далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Рабочыя тульскага заводу № 1 прапануюць **у гонар 518-ці новых заводаў і фабрык, якія ўваходзяць у строй у гэтым годзе і 1.040 машына-трактарных станцый, якія павінны быць адкрыты ў гэтым годзе, абвясьціць набор ударнікаў і разгарнуць у другім кварталe бягучага году кампанію па перагляду норм выпрацоўкі.**

Рабочыя, саўгасьнікі і калгасьнікі БССР, бязумоўна, адкажуць на гэты заклік новай хваляй спаборніцтва і ўдарніцтва, напружаньнем сіл на выкананьне і перавыкананьне пляноў. Прафсаюзныя арганізацыі павінны ўзначаліць ініцыятыву мас, павінны зараз-жа **разгарнуць масавую растлумачальную работу да закліку новых ударнікаў.** Адозву рабочых тульскага заводу № 1 трэба давесьці да кожнага рабочага, саўгасьніка і калгасьніка. Гэта адозва павінна стаць разгорнутай праграмай далейшых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Газэта **«Зьвязда»** ўключаецца ў перакліч заводаў і фабрык, новых пабудоў, саўгасаў і калгасаў, якую распачынае па закліку тульскіх рабочых газэта **«Правда»**.

Шырокім разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, баявым правядзеньнем закліку імя 518 і 1.040, мабілізацыяй мас вакол вялізарных задач трэцяга рашаючага году забясьпечым выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. 2-ю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва адзначым павялічэньнем радоў ударнікаў новымі тысячамі рабочых, якія пад кіраўніцтвам ленінскай партыі змагаюцца за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Пакажам новыя ўзоры камуністычнай працы

З адозвы рабочых тульскага заводу № 1

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ СССР, ДА ЎСІХ СЕЛЬГАСРАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ, ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І КАЛГАСЬНІЦ.

ТАВАРЫШЫ! Спаўняецца другая гадавіна пачатку спаборніцтва ў СССР. Імёны ленінскае спаборніцтва і ўдарніцтва аказаліся ў руках рабочай клясы тымі магутнымі вагарамі, пры дапамозе якіх она рушыла наперад справу перабудовы сваёй краіны з краіны адсталай, краіны дробнай, раздробленай селянскай гаспадаркі—у краіну перадавой тэхнікі і самай прагрэсыўнай у сьвеце буйной сельскай гаспадаркі. У працэсе спаборніцтва ў нетрах рабочае клясы нарадзіўся лёзунг «ПЯЦІГОДКА —ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ». Гэты лёзунг быў успрыняты працоўнымі масамі як абавязацельства ня толькі перад нашай краінай, але і перад сусьветным пралетарыятам. Выкананьне гэтага лёзунгу стала для нас «справай гонару, справай славы, справай адваги і гэройства».

Ці чулі вы аб тым, што МЫ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПАВІННЫ ПУСЬЦІЦЬ У ХОД 518 НОВЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ, ці чулі вы, што мы павінны ў гэтым годзе адкрыць НОВЫХ 1040 МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ? Падумайце над гэтымі лічбамі нашых вялізарнейшых перамог. Значэньне гэтых лічбаў асабліва паказальнае, калі прыняць пад увагу, што за чатыры папярэднія гады, з 1927 г. па 1930 г. уключна, мы пусьцілі новых прадпрыемстваў 323, а ў 1929 г. у нас была толькі АДНА машына-трактарная станцыя.

Ці ведаеце вы аб гэтым, пралетары і працоўныя? Калі вы чулі аб гэтым, калі вы ведаеце аб тых грандыёзных задачах, якія нам прадстаіць ажыцьцявіць у гэтым годзе, тое што вамі зроблена, каб ажыцьцявіць посьпех трэцяга году пяцігодкі?

У наступіўшы другі квартал рашаючага году пяцігодкі трэба праверыць, як ідзе работа, трэба праверыць, ці выстарчальныя тэмпы, якія мы разгарнулі, трэба праверыць, ці няма ў нас перабояў, прарываў, трэба разгледзець і высьветліць нашы слабыя пункты, нашы найбольш слабыя месцы і своячасова прыняць меры. Трэба, каб кожны працоўны ўзмацненьнем сваёй энэргіі дапамог своячасова пусьціць у ход гэтыя будоўлі.

Далей рабочыя заводу № 1 прыводзяць свае дасягненьні, якія яны маюць і пытаюць:

— А, як, таварышы, справа абстаіць у вас? Ці выканалі вы праграму другога кварталу? Колькі рабочых у вас ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, колькі ў вас ударных брыгад, ці ўжываеце вы метад грамадзкага буксіру, ці ёсьць «сквозные» ўдарныя брыгады, як вы вядзеце барацьбу за якасьць продукцыі, ці прынялі вы меры да таго, каб ліквідаваць брак і іншыя недахопы ў якасьці, аб якіх тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі гаварыў, што гэта—«ганебная плама» на нашай вытворчасьці? Як вы выканалі заданьне па зьніжэньні сабекошту, як шырока ў вас пастаўлена вынаходзтва і работа вытворчых нарад?

Што вы зрабілі для таго, каб правесьці ў жыцьцё лёзунг тав. СТАЛІНА АБ АЎЛАДАНЬНІ ТЭХНІКАЙ? Колькі рабочых у вас ахоплена вучобай і як у вас ідзе гэта вучоба? Як у вас вывучаецца замежная абстаяваньне і як вамі ўсвойваецца перадавая замежная тэхніка?

Да моманту заканчэньня першага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі мы прапануем арганізаваць праз «Правду» ўсесаюзную перакліч фабрык і заводаў, новых пабудоў, саўгасаў і калгасаў па ўсіх гэтых пытаньнях.

Мы прапануем: 1) давесьці да кожнага рабочага і калгасьніка лічбы нашых вялізарнейшых дасягненьняў, каб кожны ведаў, што нам затрачана столькі сіл і энэргіі. Нашы крохкія накапленьні мы не дастрацілі на вецер, а пусьцілі на будаўніцтва новых магутных гігантаў сацыялістычнай індустрыі і сацыялістычнага земляробства. Няхай на гарадзкіх пляцох, у тэатрах, кіно, клюбах, рабочых казармах, чырвоных куточках вісяць трафаретныя, плякаты і дыяграмы, якія даюць малюнак нашых перамог. Гэтыя лічбы—518 і 1040—павінны ведаць і жонкі і дзеці рабочых, калгасьнікі і калгасьніцы, середняк і бядняк—заўтрашнія калгасьнікі. Гэтыя лічбы павінны запаліць новым энтузіязмам нашы сэрцы, усіліць у кожнага працоўнага сілу і бадзёрасьць на новых перамог.

2. Мы просім газэты нашых брацкіх камуністычных партый за межамі—«РОТЭ-ФАНЭ», «ЮМАНІТЭ» «ДЭЙЛІ ВОРКЕР»—падрабязна расказаць рабочым капіталістычных краін аб гэтых нашых перамогах і дасягненьнях, як гэта зрабіла «ПРАВДА». Няхай ведаюць рабочы капіталістычных краін аб тым, што ў СССР ня [illegible]

3. МЫ ПРАПАНУЕМ У ГОНАР НОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І НОВЫХ МТС АБВЯСЬЦІЦЬ НАБОР УДАРНІКАЎ ІМЯ 518 І 1.040. НЯХАЙ У ГОНАР КОЖНАГА НОВАГА ПРАДПРЫЕМСТВА ДА ДРУГОЙ ГАДАВІНЫ САЦСПАБОРНІЦТВА І ВЯЛІЗАРНЕЙШАГА СЬВЯТА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ — ПЕРШАГА МАЯ, УВАЛЬЛЕЦЦА Ў СПАБОРНІЦТВА НОВАЯ ТЫСЯЧА УДАРНІКАЎ. ГЭТА ДАСЬЦЬ НАМ ЗВЫШ ПАЎМІЛЬЁНА НОВЫХ УДАРНІКАЎ. НЯХАЙ У ГОНАР КОЖНАЙ НОВАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ ЗЬЯВІЦЦА НОВАЯ ТЫСЯЧА УДАРНІКАЎ — КАЛГАСЬНІКАЎ І КАЛГАСЬНІЦ. ГЭТА ДАСЬЦЬ НОВУЮ УДАРНУЮ АРМІЮ РАБОТНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЗЯМЛЯРОБСТВА Ў 1.200 ТЫС. ЧАЛАВЕК.

4. МЫ ПРАПАНУЕМ РАЗГАРНУЦЬ У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ БЯГУЧАГА ГОДУ МАСАВУЮ БАЯВУЮ КАМПАНІЮ ЗА ПЕРАГЛЯД НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ. ІСНУЮЧЫЯ Ў СУЧАСНЫ МОМАНТ НОРМЫ Ў БОЛЬШАСЬЦІ ВЫПАДКАЎ УСТАРЭЛІ. ГЭТЫЯ НОРМЫ РАЎНЯЛІСЯ ВЫПРАЦОЎЦЫ СЯРЭДНЯГА РАБОЧАГА ПРЫ СТАРАЙ ТЭХНІЦЫ, А НАМ ТРЭБА БІЦЦА ЗА СУСТРЭЧНЫЯ НОРМЫ, ЗА НОРМЫ, ЯКІЯ ЗАБАВАНЫ ЛЕПШЫМІ ЎДАРНІКАМІ, БРЫГАДАМІ І ЦЭХАМІ, НАМ ТРЭБА РАЎНЯЦЦА ПА НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ РАБОЧАГА-ЎДАРНІКА. ТРЭБА ЎЛІЧЫЦЬ УСЕ ВЯЛІЗАРНЫЯ ТЭХНІЧНЫЯ ПАЛЯПШЭНЬНІ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ, ЯКІЯ Ў НАС ПРАВЕДЗЕНЫ.

Толькі пры гэтых умовах мы выканаем заданьне па павышэньні прадукцыйнасьці працы НА 28 ПРОЦ. па СССР. Гэты шлях дапаможа нам стварыць новыя накапленьні, узмацніць нашу фінансавую сыстему.

Далей, адзначаючы сыстэматычныя прарывы на Данбасе, рабочыя тульскага заводу № 1 прад'яўляюць асобы рахунак гарняком і заканчваюць адозву так:

— ТАВАРЫШЫ, уступаючы ў другі квартал бягучага году, мы зварачаемся да ўсіх рабочых і работніц заводаў СССР, да ўсіх сельска-гаспадарчых рабочых і работніц, да ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц: У НАС ЁСЬЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ, КАБ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. ДЫК ПАКАЖАМ-ЖА, ШТО МЫ ЎМЕЕМ ВЫКАРЫСТАЦЬ ГЭТЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ. МАБІЛІЗУЕМ УСЮ НАШУ ЭНЭРГІЮ, УСЮ НАШУ ВОЛЮ, СЬЦЯГНЕМ УСЕ НАШЫ РЭЗЭРВЫ, НАЛЯЖАМ УСЁЙ ШМАТМІЛЬЁННАЙ МАСАЙ І ПАД БАЛЬШАВІЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І ЯЕ ЦК ВЫКАНАЕМ І ПЕРАВЫКАНАЕМ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫ ПЛЯН 1931 ГОДУ І ЗАВЯРШЫМ ПАБУДОВУ ФУНДАМАНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ Ў СССР.

ДАЕМ СТАРТ

другому этапу культэстафэты

Прафсаюзы, культасьветныя ўстановы, камсамольскія арганізацыі, атрады культармейцаў, асьветнікі—

разьвінайцеся па фронце эстафэты

Парт'ячэйкі абавязаны забясьпечыць дзейсным кіраўніцтвам рух маршрутаў, рашуча зьнішчыць апартуністычныя рагаткі

СТАРТ ДАН

Сёньня даецца старт другога этапу культэстафэты. Другі этап, згодна першага маршруту, прадугледжвае шпаркае разгортваньне работы па карэннай перабудове ўсёй сыстэмы культ-палітасьветных устаноў, асабліва на вёсцы, тварам да выкананьня актуальнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Маршруты культэстафэты накіраваны на канчатковую ліквідацыю прарываў у справе выкананьня плянаў па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Апэрацыйная зводка аб выкананьні плянаў усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці паказвае наяўнасьць некаторага зруху ў справе ахопу школамі дзяцей 8-10 гадоваго ўзросту і ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Аднак, павялічэньне ахопу ўсеагульным навучаньнем да 98,4 проц. і асабліва нізкі працант (72,4 проц). ахопу няпісьменных лікпунктамі ні ў якім выпадку НЕ ДАЮЦЬ ПРАВА лічыць становішча гэтай работы здавальняючым. Яшчэ горш пастаўлена справа ў галіне ахопу навучаньнем перароскткаў ад 11 да 15 год.

І да гэтага часу дрэнны ўдзел у выкананьні паказаных задач прымаюць прафсаюзныя і каапэрацыйныя ўстановы.

Матар'ялы, што зьмяшчаюцца сёньня ў нашай газэце, сьведчаць АБ НАЯЎНАСЬЦІ ФАКТАЎ ПРОСТА АБУРАЮЧЫХ. ГАЛАВАЦЯПСКІХ АЛНОСІН І АПАРТУНІСТЫЧНАГА ІГНАРАВАНЬНЯ СПРАВЫ ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ І ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ З БОКУ ПААСОБНЫХ ПРАФСАЮЗНЫХ, КААПЭРАЦЫЙНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЕЛЬСАВЕТЧЫКАЎ.

Становішча ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, цяперашнія тэмпы гэтай работы прымушаюць біць трывогу, бо няма гарантыі за тое, што апартуністы сваімі ганебнымі ў радзе раёнаў тэмпамі ня змогуць прывесьці да зрыву важнейшых маршрутаў культэстафэты.

Трэба паставіць ПАД СУРОВЫ ПАРТЫЙНЫ КАНТРОЛЬ І ШТОДЗЕННАЕ КІРАЎНІЦТВА работай, як інспэктуры нарасьветы, дзейнасьць у гэтым напрамку каапэрацыйных, прафсаюзных устаноў, так і работу кожнай школы, кожнага лікпункту.

Пагардліва ганскім адносінам да гэтых мерапрыемстваў, адносінам, як да другараднай і «мапаважнай справы» трэба абвясьціць самы бязьлітасны бой.

Дабіваючыся поўнага колькаснага выкананьня пляну, трэба змагацца з усёй настойлівасьцю за якасьць навучаньня.

БАРАЦЬБА ЗА ПАЛІТЭХНІЗМ, ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ ЗА ПОЎНУЮ ЎВЯЗКУ ТЭАРЫТЫЧНАГА НАВУЧАНЬНЯ З ПРАКТЫКАЙ БУДАЎ-

Прафарганізацыі адстаюць

ЖЛОБІН. Дэкада штурму прарываў у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня дала па раёне наступныя вынікі. Наведваньне дзецьмі школы павялічылася з 97,3 проц. да 98,2 проц. Ахоп школаю перароскткаў узьняўся з 85 да 89,5 проц., ахоп лікпунктамі—з 50 да 65 проц.

Амаль усе школы раёну забясьпечаны апаламі. Толькі Бабоўскі сельсавет забясьпечыў школы апаламі часткова, бо ніяк ня здолеў арганізаваць вывазку дроў.

За час правядзеньня дэкады штурму значна паленшылася справа палітэхнізацыі школ. Многія школы прымацаваны да прадпрыемстваў саўгасаў і калгасаў. Недахоп у тым, што не на ўсіх школах арганізаваны рабочыя пакоі. Гэта перашкаджае нармальнаму правядзеньню вытворчай практыкі.

20 проц. дзяцей атрымліваюць гарачыя сьнеданьні. Гэтага, бязумоўна, далёка мала.

Такія арганізацыі, як каапэрацыя і асабліва райпрафсавет, — стаяць у баку ад гэтай важнай справы. Райпрафсавет ня ўжывае належных мер у адносінах паасобных прафсаюзаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду ў галіне хутчэйшай ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня. Прафсаюзы харчавікоў, будаўнікоў, а часткова і чыгуначнікаў ня маюць нават поўнага ўліку няпісьменных. Культармейцы вярбуюцца слаба. Штаб не працуе.

На першым месцы па раёне ідуць Майскі, Кароткаўскі і Бухарынскі сельсаветы; апошнімі—Мормальскі, Пярэвіцкі і Папаратнянскі.

МАШНІЦКІ.

Абураючая блытаніна ў забясьпячэньні вучняў

Забясьпячэньне вучняў—дзяцей беднаты—адасьнем і абуткам адыгрывае вялізарнае значэньне ў выкананьні плянаў усеагульнага навучаньня. Між тым, мы маем блытаніну ў пытаньнях забясьпячэньня вучняў па цэлым радзе менскіх школ.

МЦРК забясьпечвае вучняў школ сямігодак і школ перароскткаў рубашкамі, галёшамі, гарнітурамі... для двохгадовых дзяцей. Гэта ў той час, калі ў памянёных школах ёсьць вучні на 16-18 год... Здараецца і адваротнае, калі вучням першых класаў раздаюць абутак і адзе[illegible] надта вялікіх разьмераў.

Такое становішча мяжуе з простым шкодніцтвам. Трэба неадкладна высьветліць прычыны, што парадзяюць такое абураючае становішча, і знайсьці вінаватых.

Р. С.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

АБ СТАНЕ ЎСЕАГУЛЬНАГА АБАВЯЗКОВАГА НАВУЧАНЬНЯ (ПА 32 РАЁНАХ І ДВОХ ГАРАДОХ) І ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ (ПА 33 РАЁНАХ І ДВОХ ГАРАДОХ) НА 20 САКАВІКА 1931 ГОДУ

1. Вызначана, паводле пляну, адкрыць 480 новых школьных камплектаў.
2. Фактычна 504.
3. На вучоце 122.758 дзяцей 8-10-гадоваго ўзросту, якія падлягаюць абавязковаму навучаньню.
4. З іх фактычна ахоплена пачатковай школай 120.815 чал. (98,4 проц.).
5. Ёсьць на вучоце 47.549 падросткаў 11-15-гадовага ўзросту, што падлягаюць абавязковаму навучаньню.
6. З іх навучаюцца ў школах 44.758 чал.—94,1 проц.
7. Не хапае 79 настаўнікаў для 1 канцэнтру.
8. Лік вучняў першага канцэнтру, забясьпечаных гарачымі сьнеданьнямі, складае 37.661 чал.
9. Вучняў другога канцэнтру, забясьпечаных гарачым сьнеданьнем, — 7.977 чал.
10. Вучні школ забясьпечаны гарачым сьнеданьнем у ліку 22 чал.
11. На вучоце 153.464 чал. няпісьменных ва ўзросьце ад 15 да 45 год.
12. З іх фактычна ахоплена навучаньнем 110.728 чал.—72,4 проц.
13. Паводле пляну вызначана мабілізаваць добраахвотнікаў—культ-
14. Фактычна мабілізавана роўна [illegible]

Па-баявому, па-камсамольску

ГЛУСК. Глуская камсамолія па-баявому ўзялася за правядзеньне важнейшага маршруту культэстафэты—ліквідацыю прарываў ва ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці.

21 сакавіка адбыўся агульнаместачковы сход камсамольскай арганізацыі, прысьвечаны пытаньням становішча ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці на раёне і пастановам ЦК ЛКСМБ на дакладу РК ЛКСМБ. 22 сакавіка сабраўся нечарговы пленум райкому камсамолу разам з сакратарамі камсамольскіх ячэек. Гэты пленум быў склікан на працягу 16 гадзін. На пленуме заслухалі даклад раённага інспэктара нарасьветы аб становішчы ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці ў раёне і інфармацыю аб пастановах бюро ЦК ЛКСМБ. Пленум у сваіх настановах адзначыў, што з боку бюро райкому ЛКСМБ мела месца апартуністычная недаацэнка важнасьці гэтага пытаньня; ён рашуча асудзіў гэту недаацэнку і вызначыў рад мерапрыемстваў па ліквідацыі прарываў.

Пленум праходзіў з выключным падъёмам і актыўнасьцю; ня гледзячы на тое, што ячэйкі знаходзяцца за 15-45 клм. ад раённага цэнтру, члены пленуму і сакратары ячэек сабраліся своячасова.

З 22 сакавіка па 1 красавіка пленум абвясьціў трывогу ў арганізацыі па ліквідацыі прарываў на гэтым важнейшым фронце. Пленум даручыў бюро райкому прыцягнуць да камсамольскай адказнасьці за яўна апартуністычныя адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці камсамолку-палітінспэктара—тав. Ваўчок (яе ўжо зьнялі з работы).

Амаль па ўсіх ячэйках абгаворана пытаньне ліквідацыі прарываў і пастановы бюро ЦК і пленуму РК ЛКСМБ.

На сёньнішні дзень у Парэцкім сельсавеце ахоплена лікпунктамі 90,3 проц. няпісьменных, па мястэчку Глуску і Хваставіцкім сельсавеце ахоп няпісьменных лікпунктамі даходзіць да 95 проц. Хутка будзе скончана мабілізацыя 75 камсамольцаў на работу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Вялікі пад'ём у рабоце назіраецца ў местачковых ячэйках. У школах Глуску ўведзены гарачыя сьнеданьні; праведзены местачковыя сходы няпісьменных.

Па раёне праводзіцца ў другі раз перапіс няпісьменных. Арганізавана 15 новых лікпунктаў. Па саматужных прадпрыемствах і ўстановах мястэчка праведзены мітынгі, прысьвечаныя ліквідацыі прарываў і трывозе, што была абвешчана райкомам ЛКСМБ.

Уся работа пачынае ўвязваецца з падрыхтоўкай да правядзеньня другога этапу культэстафэты.

Рабінскі.

Сторшыня Цітоў зняты „важнымі справамі"

МАГІЛЕЎ. У Дашкаўскім сельсавеце, ня гледзячы на тое, што ў кожнай вёсцы ёсьць школа, ліквідацыя няпісьменнасьці зрываецца. Навіны ўсьвядомілі сельсаветскія работнікі нашасьць гэтай справы, можа сказаць, наступны факт. Калі ў Дашкаўку прыехала брыгада па ліквідацыі прарываў ва ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці і аказалася да старшыні сельсавету тав. Цітова за весткамі, той адказаў:

— У мяне ёсьць не такія важныя справы!

Брыгада нават ня здолела высьветліць, ці ёсьць пры сельсавеце камісія садзейнасьці ўсеагульнаму навучаньню і ліквідацыі няпісьменнасьці. Ячэйка таварыства «Праф няпісьменнасьць» існуе толькі ў архіўных запісах...

Большасьць лікпунктаў увесь час бязьдзейнічала. Дзе-ні-дзе іх наведвалі 3-4 чалавекі. Характэрна, што ў в. Сталіц лікпункт не працаваў толькі таму, што ня было лямпы, а настаўнік Лададанскі палец аб палец ня стукнуў для таго, каб набыць лямпу ды распачаць заняткі.

Партыйная і камсамольская ячэйкі [illegible] на працы.

На камсамольскім сходзе, разам з культактывам, брыгада зрабіла інфармацыю аб выніках праверкі ліквідацыі прарываў. Там-жа на сходзе быў пэўны кірунак у далейшай рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці і па ўсеагульным навучаньні. На нарадзе актыву пры сельсавеце выбран новы культштаб.

Цяпер з пачаткам другога этапу ўсебеларускай культэстафэты дашкаўскія работнікі павінны з новымі сіламі ўзяцца за правядзеньне ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыю няпісьменнасьці.

К. Н.

Дзе ты, тройка?

СМАЛЯВІЧЫ. Ліквідацыі няпісьменнасьці па Жодзінскім сельсавеце не надаецца патрэбнай увагі. Напрыклад, сярод няпісьменнай часткі рабочых саўгасу Зарэчча гэта работа зусім не праводзіцца. Ліквідатары—настаўнікі сьпяць.

Жодзінская кіруючая тройка таксама «спачула ад спрэю». Між тым, хутка скончыцца зіма...

Другі этап усебеларускай культэстафэты пагінен, парэшце, закрануць і Жодзіна!

МАЛАПІСЬМЕННЫ.

Шкладувы „Камінтэрну" высунулі новы сустрэчны

ДА ХАЛОДНАГА РАМОНТУ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ

Практыку высоўваньня сустрэчных прамфінпляноў на другі квартал пашырыць па ўсіх прадпрыемствах БССР

Ударнікі, бярэце прыклад з рабочых картоннай фабрыкі імя Сталіна і гуты „Камінтэрн" якія па-бальшавіцку змагаюцца за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

Дабіцца зноў чырвонай дошкі

ГУТА «КАМІНТЭРН» (БАБРУЙСКАГА РАЁНУ) ТЭМПАЎ РАБОТЫ НЕ АСЛАБЛЯЕ. НААДВАРОТ, ГАНАРОВАГА ЗВАНЬНЯ ЎДАРНАГА ЗАВОДУ І ЧЫРВОНАЙ ДОШКІ, НА ЯКУЮ ГУТА БЫЛА ЗАНЕСЕНА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ, ЯНА ДАБ'ЕЦЦА ЗНОЎ, ДЗЯКУЮЧЫ ЭНТУЗІЯЗМУ РАБОЧЫХ.

25-ГА САКАВІКА РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ ГУТЫ ПРЫНЯЛІ НОВЫ СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН, ЯКІ ПАВІНЕН ДАЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ НЯ ТОЛЬКІ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН. ЗАМЕСТ 1.198 БУТЭЛЕК У СЯРЭДНІМ МАЙСТРЫ-ШКЛАДУВЫ ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ДАЦЬ 1.350 БУТЭЛЕК. ГЭТА ДАСЬЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ ДА ПАЧАТКУ ХАЛОДНАГА РАМОНТУ ЗАВОДУ ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ І ПАКРЫЦЬ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ.

СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ШКЛАДУВЫ ЎЖО ПАЧАЛІ ВЫКОНВАЦЬ. ВОЙ НАЧЫНЬНЯ, ЯКІ ДАСЯГАЎ 4-5 ПРОЦ., ЗАРАЗ СКЛАДАЕ ТОЛЬКІ 2-3 ПРОЦ.

ЗЬМЕНА СА ЗЬМЕНАЙ ВЯДЗЕ ЎПАРТУЮ БАРАЦЬБУ ЗА АТРЫМАНЬНЕ ПЕРАХОДНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ. КАЛІ РАНЕЙ ЗЬМЕНА ВЫПРАЦОЎВАЛА ЎСЯГО 10-11 ТЫСЯЧ АДЗІНАК, ДЫК ЗАРАЗ ВЫПРАЦОЎКА ДАХОДЗІЦЬ ДА 13 ТЫСЯЧ І БОЛЬШ.

УСЬВЯДОМЛЯЮЧЫ ПОЎНАСЬЦЮ НЕАВХОДНАСЬЦЬ ВЫКАНАЦЬ ПЯЦІГОДКУ ЗА ЧАТЫРЫ І ТРЫ ГАДЫ, ЎДАРНІКІ І РАБОЧЫЯ ГУТЫ «КАМІНТЭРН» УПАРТА БЮЦЦА ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ СВАЯГО ПРАМФІНПЛЯНУ.

В. П. ШАЎЧУК.

Ці няма тут шкодніцтва?

У жніўні мінулага году была закуплена 600-сілавая паравая машына для ўстаноўкі на пашай галяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» (Чашнікі). Перавозка яе цягнулася 6 месяцаў. Калі-ж машыну прывезьлі на фабрыку, аказалася, што яна ўжо не патрэбна. Такую думку выказала камісія, якая прыяжджала ад Саюзпаперы.

Машына, якая каштавала разам з перавозкаю 27.644 руб., стаіць і зараз на дварэ фабрыкі без карысьці.

Адпаведныя органы павінны заняцца гэтай справай.

Л. Стэрлін.

Месячнік штурму на акулярнай фабрыцы

Нечарговы сход парткалектыву віцебскай акулярнай фабрыкі, прысьвечаны прарыву ў выкананьні прамфінпляну пастанавіў правесьці з 1-га красавіка **месячнік штурму.** Уся партарганізацыя мабілізавана на ліквідацыю прарываў. Выначан рад практычных мерапрыемстваў. Пастаноўлена на працягу 3-х дзён пераглядзець інструктарскі склад цэхаў, папоўніць яго вопытнымі старымі рабочымі фабрыкі; мабілізаваць камсамольскую арганізацыю на барацьбу з браком і стратамі, арганізаваць рабкораўскія брыгады і пасты шматтыражкі «Чырвоная акулярніца», разгарнуць масавую работу ў цэхах, дабіўшыся 100 проц. ударніцтва.

Гэта пастанова пакладзе па партыйную арганізацыю ў першую чаргу і ўвесь рабочы калектыў у цялым вялікую адказнасьць за пасьпяховае праведзеньне месячніка штурму. Прарыў па акулярнай фабрыцы, якая мае ўсе магчымасьці для выкананьня прамфінпляну, павінен быць ліквідаваны на працягу месячніка штурму.

Шумкаў.

Будзем змагацца за поўнае выкананьне прамфінпляну другога кварталу

РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА»

Агульны сход рабочых і служачых пямцава-яроўчай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» пасылае сваё шчырае пралетарскае прывітаньне цэнтральнаму органу КП(б)Б — газэце «Зьвязда».

Прынятыя на сябе абавязацельствы па выкананьні пяцігадовага пляну за чатыры гады мы выконваем ня толькі на словах, але і на справе. За 1929-30 г. мы выканалі праграму на 103,8 проц., за асобны квартал — на 101,5 проц., а за першы квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі праграма выканана 31-га САКАВІКА ў 4 ГАДЗІНЫ ДНЯ НА 100,2 ПРОЦ. Заданьне па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы выканана на 103,6 проц. Значны пералом мы маем у папяпшэньні якасьці прадукцыі.

Усе гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай камуністычнай партыі, перабудове прафработы тварам да вытворчасьці і ўжываньню новых сацыялістычных мэтадаў работы.

Рабочыя «Чырвонага Кастрычніка» абяцаюць і ў далейшым яшчэ больш змагацца за выкананьне прамфінпляну другога кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі і павесьці жорсткую барацьбу з усякімі падрыўнікамі выкананьня прамфінпляну, ныцікамі, малаверамі, правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Паводле пастановы агульнага сходу рабочых фабрыка ўключылася ў конкурс на л

Масавым пралетарскім кантролем над дзяржапаратам

ЗАБЯСПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ ЯГО ПЕРАБУДОВЫ

Замацаваць дасягненьні месячніка шэфства

ПАМЯТАЦЬ, ШТО: *шэфства прадпрыемстваў над установамі—„гэта сапраўдная новая сіла, якая павінна перабудаваць апарат і выкарчаваць бюракратызм“.*
(З дакладу тав. Кагановіча на XVI зьезьдзе ЎсеКП(б)

Калі адгрымелі аркестры...

Гэта было многа месяцаў таму назад. У адзін з прыгожых вечароў адбыўся ўрачыстае прыняцьце шэфства рабочых МЕНСКАГА ХЛЕБАЗАВОДУ НАД АПАРАТАМ ГАРАДЗКОГА ФІНАДДЗЕЛУ. Вечар прайшоў вельмі актыўна. У гарачых прамовах прадстаўнікі будучых шэфаў абяцалі падшэфнай установе сыстэматычную дапамогу ў рабоце, штодзенны кантроль над апаратам.

Але адгрымелі аркестры. Шэфы і падшэфныя разыйшліся па дамох і назаўтра... забыліся пра ўчарайшы вечар. ДА ПРАКТЫЧНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ МАСАВАГА РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ НАД АПАРАТАМ ГАРФА ЗУСІМ НЯ ПРЫСТУПЛЕНА. Рабочыя хлебазаводу ня ўцягнуты ў шэфскую работу, многія з іх нават і ня ведаюць, над кім яны шэфствуюць. Так справа стаяла да апошняга часу.

Наступіў МЕСЯЧНІК ПРАВЕРКІ І АРГАНІЗАЦЫІ ШЭФСТВА. Што-ж зрабілі партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі хлебазаводу і гарфа для ўзмацненьня шэфства, аднаўленьня зусім забытай работы?

На жаль, НІЧОГА. На запытаньне брыгады «Зьвязды» сакратару партыйнай ячэйкі гарфа, што мяркуецца зрабіць для ўзмацненьня шэфскай работы ў далейшым, ён адказаў:

— Мы думаем склікаць сход рабочых-шэфаў разам з падшэфнымі і на ім абгаварыць гэтае пытаньне.

Але ўсё гэта пакуль што толькі мяркуецца...

Брыгада «Зьвязды»:
Шыталевіч, Рэцкая, Брэйтман.

Гарбары ўзмацняюць кантроль над дзяржапаратам

Прэзыдыум ЦП саюзу гарбароў заслухаў даклад аб становішчы шэфства скурпрадпрыемстваў над дзяржаўным апаратам. Прэзыдыум канстатаваў, што на радзе прадпрыемстваў шэфства існавала фактычна толькі на паперы. Партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі прадпрыемстваў не аддавалі ўвагі гэтай рабоце. **Шавецкая майстэрня «Уціль»** да апошняга часу зусім ня мела падшэфнай установы, толькі нядаўна яна ўзяла шэфства над цэнтральнай аптэкай. Вылучаныя брыгады прыступілі да практычнай работы.

Фабком **рымарнай фабрыкі «Усход»** злачынна ігнараваў пытаньні шэфства. Недаацэньваючы значэньне рабочага кантролю над савецкім апаратам, фабком рымарнай фабрыкі зусім ня цікавіўся гэтай работай. **Прэзыдыум паставіў гэта фабкому на від.**

Гарбарня **«Бальшавік»** шэфствуе над банкаўскімі ўстановамі. За апошні час работа значна палепшылася. На заводзе створаны курсы па вывучэньні крэдытнай рэформы. У свой час завод вылучыў чатырох лепшых рабочых - ударнікаў па работу ў банкаўскія ўстановы. Вылучэнцы сябе поўнасьцю апраўдваюць. Заводзкія арганізацыі пачалі аддаваць пытаньням шэфства належную ўвагу.

Абутковая фабрыка Гандальбуду вылучыла ў падшэфную ўстанову — скурсындыкат — 8 брыгад, якія абсьледуюць кожную галіну работы сындыкату.

Трэба адзначыць, што рабочыя-шэфы прымаюць вельмі слабы ўдзел у чыстцы апарату скурсындыкату, якая зараз адбываецца. У выніку чыстка праходзіць слаба.

Прэзыдыум прыняў рад практычных мерапрыемстваў для ўзмацненьня шэфства скурпрадпрыемстваў над дзяржапаратам.

Да арганізацыі Койданаўскага вопытна-паказальнага раёну

З пастановы калегіі НК-РСІ БССР

Калегія НК-РСІ БССР у сваёй пастанове аб арганізацыі Койданаўскага вопытна-паказальнага РВК і трох сельскіх саветаў вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў па правядзеньні гэтай работы. Складзена брыгада з прадстаўнікоў Дзяржпляну, НКЗему, НКФіну, НКСнабу, аргандзелу ЦВК БССР, вопытнай станцыі, Наркампрацы, ВСНГБ, галоўкіраўніцтва ашчадкасамі, Белкаапсаюзу, Белкалгасцэнтру, БВА,—на якую ўскладзена правядзеньне ўсёй работы. Кіраўніком брыгады назначан член калегіі НК-РСІ тав. **Жукаў.**

Калегія зьвярнулася да факультэту савецкага будаўніцтва і права ВДУ з просьбай прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі вопытна-паказальнага раёну і сельсаветаў. Савецкай групе НК-РСІ даручана ўстанавіць пастаянную сувязь з радам навукова-дасьледчых устаноў і ўцягнуць іх у работу па рэарганізацыі Койданаўчыны.

Рэарганізацыя раёну будзе працягвацца да 1-га ліпеня бягучага году. На час з першага красавіка да 1-га ліпеня калегія НК-РСІ забараніла ўсім цэнтральным установам абсьледваньне савецкіх органаў Койданаўскага раёну. Калегія абавязала беларускае кіраўніцтва сувязі арганізаваць пастаноўку вопытна-паказальнай сувязі ў Койданаўскім раёне, увязваючы гэту работу з брыгадай НК-РСІ.

У пачатку мая на пасяджэньні Калегіі будзе заслухан даклад брыгады аб ходзе работы.

НЕ АСЛАБЛЯЦЬ РАБОТЫ

(Шчотачная ф-ка—Белдзяржснаб)

Менская ШЧОТАЧНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ да апошняга часу шэфставала над ПЕРШАЙ САВЕЦКАЙ БОЛЬНІЦАЙ, але гэта было шэфства выключна на паперы. Рабочыя фабрыкі зусім ня былі зьвязаны з падшэфнай установай і нават ня ведалі, над кім шэфствуюць. Фабрычныя арганізацыі не ўдзяляньвалі значэньня шэфства і зусім не цікавіліся гэтай справай.

Пэўны пералом унёс месячнік шэфства. Фабрыка прыняла шэфства над БЕЛДЗЯРЖСНАБАМ, распрацаваны канкрэтны плян работы, арганізаваны брыгады добраахвотнікаў.

Фабрычныя арганізацыі павінны не аслабляць работы і на далей. Трэба наладзіць сыстэматычную сувязь рабочых з падшэфнай установай, арганізаваць сапраўды дзейсны масавы пралетарскі кантроль над работай апарату Белдзяржснабу.

Брыгадэір «Зьвязды» Р. Л.

Дабіліся зруху

МАЗЫР. (Наш кар.).

Да апошняга часу на прадпрыемствах Мазыру аддавалася зусім мала ўвагі шэфству рабочых над дзяржаўным апаратам. Рад фабрычна-заводзкіх арганізацый нават ня ведалі, над кім яны шэфствуюць. Так, старшыня фабкому і сакратар парт'ячэйкі фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» на запытаньне, над кім шэфствуе фабрыка, адказалі:

— А хто яго ведае, здаецца, калісьці шэфствавалі над акра.

Месячнік праверкі і арганізацыі шэфства над савецкім апаратам даў пэўны зрух у гэтай справе. РайКК-РСІ складзен штаб кіраўніцтва шэфскай работай. Фабрыка «Чырвоны Кастрычнік», завод «Пралетары», райкамбінат і трупком будаўнікоў узялі шэфства над рознымі ўстановамі.

Нядаўна адбыўся агульна гарадзкі сход партыйнага, прафэсыянальнага і камсамольскага актыву, прысьвечаны шэфству. Сход вынёс рад пастаноў, у якіх вызначаны мерапрыемствы па ўзмацненьні масавага рабочага кантролю над савецкім апаратам.

З. З—н.

Бабіцкі сельсавет патурае кулакам

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Бабіцкі сельсавет праўляе недапушчальную літасьць да кулакоў. Да гэтага часу сельсавет нічога не зрабіў для выяўленьня ўсіх кулацкіх гаспадарак і для дачы ім цьвёрдых заданьняў па ўсіх відах загатовак. Пад носам у сельсавету кулакі прадаюць і разбазарваюць сваю маемасьць. Так, кулак **Сьмяян Кастусь**, які меў 4 дамы, 3 коняй, 8 кароваў і г. д., разбазарыў амаль усю сваю маемасьць.

Райвыканком павінен неадкладна правяць работу сельсавету і прыцягнуць вінаватых у патуранні кулакам да адказнасьці. К.

Белкаапсаюз-- да пасеўкампаніі

Белкаапсаюз адкрывае на пэрыяд пасеўнай кампаніі ў калгасах і саўгасах БССР дзіцячыя яслі і пляцоўкі. У калгасах будзе адкрыта 39 часовых ясляй і 18 пляцовак, у саўгасах—14 ясляй і 13 пляцовак, на торфараспрацоўках—10 ясляй і 3 пляцоўкі і для аднаасобнікаў—4 яслі і 5 пляцовак.

У бягучым годзе будуць таксама адкрыты пастаянныя дзіцячыя яслі і пляцоўкі: у калгасах 69, у саўгасах 15, у прамысловых раёнах 6.

Акрамя таго, Белкаапсаюз пастанавіў пабудаваць ў калгасах 6 лазьняй і 10 цырулень. С.

Веснавыя загатоўкі бульбы

Масква і Ленінград
чакаюць нашай бульбы

Выканаем свой абавязак перад пралетарскімі цэнтрамі

Поўнасьцю скарыстаць санную дарогу. Да аднлігі скончыць адгрузку

ФАРСАВАЦЬ ЗАГАТОЎКУ І АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ

Пастановы партыі і ўраду аб загатоўках бульбы выконваюцца недапушчальна марудна. Раённыя арганізацыі да гэтага часу не пераключыліся на ўдарныя тэмпы работы і не забясьпечваюць поўнага выкананьня плянаў загатоўкі і нарадаў на вывяз. Тэлеграма тав. Балціна, якую мы сёньня друкуем, выклікана выключна дрэнным выкананьнем раённамі сваіх заданьняў. За 10 дзён—з 25 сакавіка да 5 красавіка—адгружана бульбы на Ленінград усяго... 30 тон, у Маскву не адгружана ні аднэй тоны.

Ёсьць раёны, якія злосна сабатуюць адгрузку бульбы. Так, з КАСЬЦЮКОВІЦКАГА раёну тэлеграфуюць: «Нарадаў на бульбу не дасылайце, бо вывазка райвыканкомам забаронена». Чэрвеньскія, крупскія і нараўлянскія загатоўчыя арганізацыі катэгарычна адмовіліся адгружаць бульбу, матывуючы гэта рознымі «аб'ектыўнымі прычынамі». Гэтыя арганізацыі яўна недаацэньваюць значэньня загатовак і адгрузкі бульбы прамысловым цэнтрам нашай краіны.

Замест таго, каб мабілізаваць усе сілы, усю энэргію на выкананьне заданьняў партыі і ўраду, раённыя арганізацыі абмяжоўваюцца бюракратычнымі адпіскамі аб нерэальнасьці заданьняў, аб немагчымасьці выканаць нарады.

Якое становішча мы маем на фронце бульбазагатовак? Апошняя зводка Белсадгароднінны сыгналізуе аб пагрозе правядзеньню гэтай важнейшай кампаніі. Сёньнішнія тэмпы загатовак ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня кантрольнай лічбы — 270 тыс. тон бульбы. Даволі сказаць, што за пяць дзён з 25 па 31 сакавіка па БССР загатоўлена ўсяго 417 тон бульбы. Многія раёны за гэты час не загатовілі ні аднэй тоны. Да гэтых раёнаў адносяцца: АЗАРЫЦКІ, АСЬВЕЙСКІ, БАГУШЭЎСКІ, БЯГОМЛЬСКІ, БЯРЭЗІНСКІ, ВЫСАЧАНСКІ, ВАЛЫНЕЦКІ, ВЕТРЫНСКІ, ГАРАДОЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ, ЖУРАВІЦКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, КЛІЧАЎСКІ, КАМАРЫНСКІ, КЛІМАВІЦКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, КРЫЧАЎСКІ, КАРАЛІНСКІ, КОЙДАНАЎСКІ, ЛЯДНЯНСКІ, ХАЛОПЕНІЦКІ І ІНШ. Інакш як АПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЮ, спадзяваньнем на самацёк гэтага тлумачыць нельга.

Рад раёнаў застаўся ў вялікім даўгу з часу асеньніх загатовак бульбы. Так ПАРЫЦКІ раён выканаў заданьне з пачатку кампаніі толькі на 31,7%, ЛЕЛЬЧЫЦКІ—на 41,2%, КАПЫЛЬСКІ—46,3 проц., КОЙДАНАЎСКІ—47,8 проц., КЛІМАВІЦКІ—47,2 проц., ВІЦЕБСКІ—45,1%, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ—42,3 проц., ЧАЧЭРСКІ—46,6 проц., ЧЭРЫКАЎСКІ—46,2% і г. д.

Ганебна нізкія тэмпы загатовак зьяўляюцца непасрэднай пагрозай выкананьню плянаў адгрузкі бульбы ў Маскву і Ленінград. Паводле пастановы ўраду Саюзу, БССР павінна адгрузіць у Маскву і Ленінград 61 ТЫС. ТОН БУЛЬБЫ.

Трэба неадкладна фарсаваць загатоўку і вывазку. З кожным днём пасьля адлігі вываз бульбы будзе ўскладняцца. Часу засталося вельмі мала, яго трэба выкарыстаць на ўсе 100 проц.

СЫГНАЛЫ З РАЁНАЎ

МЯЖА. (Наш кар.). Загатоўка бульбы па раёне праходзіць недапушчальна марудна. За пяцідзеньку з 25-га да 31-га сакавіка не загатоўлена ніводнай тоны. Сыстэма Белкаапсаюзу і Белсадгароднінны бязьдзейнічаюць. Усяго з пачатку кампаніі па раёне выкапана толькі 21,3 проц. агульнага плану.

***

КРУПКІ. (Наш кар.). За пяцідзеньку з 25-га да 31-га сакавіка сыстэма Белсадгароднінны загатовіла толькі 1,5 тоны бульбы. Сыстэма Белкаапсаюзу не загатовіла ніводнай тоны. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай бязьдзейнасьці загатоўчых арганізацый, якія зрываюць забясьпячэньне бульбай прамысловых цэнтраў нашай краіны.

***

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Ніякага зруху ў ходзе загатовак бульбы па раёне няма. Ня гледзячы на выразныя дырэктывы вышэйшых органаў аб фарсаваньні загатовак, загатоўчыя арганізацыі нічога ня робяць для ўзмацненьня кампаніі. За час з 25-га да 31-га сакавіка сыстэма Белкаапсаюзу загатовіла толькі 0,9 тоны бульбы, сыстэма-ж Белсадгароднінны не загатовіла ніводнай тоны.

***

ГОРКІ. (Наш кар.). Тэмпы загатовак бульбы па раёне вельці слабыя; усяго за пяцідзеньку з 25-га да 31-га сакавіка загатоўлена 18 з паловай тон бульбы. Раённая сыстэма Белсадгароднінны загатовіла 5,9 тон, Белкаапсаюзу 12,6 тоны.

***

КОПЫСЬ. (Наш кар.). Раённыя загатоўчыя арганізацыі ня выконваюць дырэктыў Наркамснабу аб загатоўцы бульбы. Сыстэма Белкаапсаюзу за пяцідзеньку не загатовіла ніводнай тоны. Сыстэма Белсадгароднінны загатовіла 12,2 тоны.

Бульбу—пралетарскай сталіцы

За подпісам Наркамснаба БССР тав. **Балціна**, 41 раёну, якія маюць нарады на адгрузку бульбы ў Маскву, накіравана тэлеграма наступнага зьместу: „Прапануецца прыняць усе меры да поўнага выкананьня нараду вывазкі бульбы на Маскву. Тэрмін адгрузкі 10 дзён. Інфармуйце Наркамснаб аб ходзе адгрузкі. Прымайце меры супроць падмаражваньня бульбы ў дарозе“.

Недапісаны адрывок з мертвых душ

Быў пэрыяд, калі сэктары ЦСПСБ горача ўзяліся за вярбоўку добраахвотнікаў. Гэта было пасьля рэзкіх выступленьняў друку аб буйнейшых прарывах у рабоце прафарганізацыі БССР. Адным з асноўных прарываў друк адзначаў **адсутнасьць добраахвотнікаў у апараце ЦСПСБ.**

Сэктары ўзварушыліся. Згарача ўсе кінуліся на прадпрыемствы вербаваць добраахвотнікаў. Кожны сэктар для сябе. Кожны сэктар па-свойму. Здаралася, што ў адным фабзаўкоме сустракаліся работнікі некалькіх сэктароў. Гналіся за колькасьцю. Пабольш добраахвотнікаў. Аб падборы людзей ня было часу падумаць.

Праз кароткі час сьпісы добраахвотнікаў па некалькі дзесяткаў чалавек мірна ляглі ў папкі сэктароў. Пачалася, так званае, «скарыстаньне» добраахвотнікаў для розных даручэньняў.

Першым паказаў прыклад **аргсэктар.** Ён тры разы склікаў сваіх добраахвотнікаў, але тыя не зьяўляліся. Гэта вельмі красамоўна сьведчыла аб «якасьці» вярбоўкі. Нарэшце, зьявілася 10 чалавек. Зусім правільна было вырашана паслаць іх у першую чаргу для абсьледваньня работы з добраахвотнікамі па ЦП саюзаў. Выбралі саюзы мэталістаў, чыгуначнікаў і мэдсанпрацы. Добраахвотнікі пайшлі. Абсьледвалі. Склікалі нават накалькі нарад добраахвотнікаў пры ЦП. Сабралі багаты матар'ял, які мог паслужыць асновай для дырэктыўнага ліста прэзыдыуму ЦСПСБ. Можна было гэты матар'ял зрабіць адпраўным пунктам для ажыўленьня работы з добраахвотнікамі ў штабе ўсіх прафсаюзаў БССР, для вэйнічэньня недахопаў, для абмену лепшым вопытам работы з добраахвотнікамі і г. д. Але аргсэктар ЦСПСБ забыўся на даручэньне, якое ён даў сваім добраахвотнікам. Праходзілі тыдні, **месяцы**, а аргсэктар не патрабаваў ад сваіх добраахвотнікаў справаздачы аб праробленым, больш ня склікаў іх, іншых даручэньняў не даваў... Карацей кажучы, **інстытут добраахвотнікаў пры аргсэктары разваліўся**, расьсеяўся, як дым, пакінуўшы толькі для заспакаеньня загадчыка сэктарам тав. **Гінілкевіча** сьпіс прозьвішч 33 добраахвотнікаў, з якіх $^2/_3$ ні разу не зьявіліся на сьветлыя вочы іх арганізатара. Прапаў добры пачын, **зьніклі вынікі цікавага абсьледваньня**, дарма патрацілі добраахвотнікі некалькі вечароў каштоўнага часу...

Аб добраахвотніках **культсэктару** можна мець уяўленьне толькі са слоў загадчыка сэктарам тав. **Клімковіча.** Уліку работы добраахвотнікаў няма. Карткі ўліку УсеЦСПС (форма № 1) амаль не запаўняліся. Калі меркаваць па картках, дык 12 добраахвотнікаў за 5-6 месяцаў атрымалі па адным заданьні, 8—па 2 і 1 добраахвотнік—3 заданьні. З пратаколаў нарад добраахвотнікаў захаваўся толькі адзін—ад 4-га сьнежня 1930 году—і паказана ў ім **5 удзельнікаў.** Справаздач добраахвотнікаў аб праробленым ёсьць толькі 6 па розных пытаньнях. Тав. Клімковіч апраўдвае хаос ва ўліку адсутнасьцю сакратара і расказвае, што ўсяго добраахвотнікаў налічваецца чалавек 40, з іх чалавек 20 выканалі па 2-3 заданьні, чалавек 10—па 1 заданьні, а чалавек 10 зусім ня прыходзілі. Ці расьце кадр добраахвотнікаў? Быў **усяго толькі адзін выпадак**, калі работніца прывяла з сабой таварыша. Вельмі кепска зьбіраюцца. Групе добраахвотнікаў, якая не наведвае нарады, пачалі рассылаць заданьні **на дом** (!!). Вынікаў гэтага арыгінальнага «мэтаду» яшчэ няма (і наўрад ці будуць), але, як бачыце, робіцца **«ўсё»** для ўцяжэньня добраахвотнікаў у прафработу.

Сэктар кадраў, які, здавалася, павінен у першую чаргу паклапаціцца аб інстытуце добраахвотнікаў для падрыхтоўкі прафкадраў, завербаваў усяго... **6 добраахвотнікаў**, але і гэтыя ня прыходзяць. Сэктар кадраў гэтым фактам ня ўстурбован. У яго распаражэньні ёсьць 68 курсантаў 6-цімесячнай прафшколы і 148—10-ці месячнай. Для 4-5 абсьледваньняў курсанты былі скарыстаны на ўсе 100 проц. Да чаго-ж, ставіцца пытаньне, стварацъ яшчэ спэцыяльны інстытут добраахвотнікаў пры сэктары?

У сэктары **масавых кампаній** таксама ня было... сакратара. Таму ўліку няма. Першыя запісы ва вучотных картках датаваны **лістападам 1930 году.** З таго часу ніхто іх у руках ня браў. І зноў прыходзіцца верыць на слова. Загадчык сэктарам тав. **Плешакоў** заяўляе, што добраахвотнікаў у яго лічыцца 36, але з іх 18 ні разу не зьявіліся, ня гледзячы на 3 запрашэньні. Іншыя **скарыстоўваліся** (гэта адзіны тэрмін у рабоце добраахвотнікаў, з якім знаёмы загадчыкі сэктароў ЦСПСБ). За 6 месяцаў было 5 нарад з добраахвотнікамі: адна агульная—аб задачах добраахвотнікаў, 4—па пытаньнях абсьледваньня. У 2-х абсьледваньнях прымалі ўдзел па 17 чалавек, у 3—8, у 4—5. Пахваліцца няма чым!

У сэктары **вытворчасьці і зарплаты** 27 добраахвотнікаў. 2-3 разы выбіраліся, больш ня ідуць. На адну нараду, скліканую нядаўна, з 27 добраахвотнікаў прышоў... **адзін.**

Толькі у **сацыяльна-бытавым сэктары** з добраахвотнікамі справа стаіць **добра.** Іншыя сэктары прабуюць гэта тлумачыць «спэцыфічнасьцю» сэктару (добраахвотнікі, быццам, цікавяцца сталоўкамі, рабочым забесьпячэньнем і больш нічым), не заўважаючы, як скочваюцца да апартуністычнай установкі аб тым, быццам актывіста-рабочага цікавяць толькі «каапэрацыйныя» пытаньні. Справа, вразумела, ня ў «спэцыфічнасьці» сацыяльна-бытавога сэктару а ў тым, што з **добраахвотнікамі праведзена вялікая арганізацыйная работа.**

Па-першае, у сацыяльна-бытавым сэктары ёсьць улік, чаго няма ні ў адным іншым сэктары. І ўлік вядзецца **сыстэматычна.** Па-другое, вялікае значэньне маюць **правільныя мэтады работы з добраахвотнікамі.** Плян работы сэктару прапрацаваны з добраахвотнікамі (чаго не зрабілі іншыя сэктары). Кожнае заданьне прапрацоўваецца з добраахвотнікамі самым уважлівым чынам. У працэсе работы сэктар трымае сувязь з кожным добраахвотнікам—асабіста ці па тэлефоне. Аб выніках абсьледваньня інфармуюць самі добраахвотнікі на шырокіх нарадах зацікаўленых арганізацый з удзелам сацыяльна-бытавых сэктароў фабзаўкомаў і ўсяго складу добраахвотнікаў (каля 60 чалавек). Ня было нарады, на якой-бы ня выступіла 10-12 добраахвотнікаў. Ня было дакладаў сэктару на прэзыдыуме ЦСПСБ без папярэдніх абсьледваньняў і прапарэдуючых пытаньняў добраахвотнікамі сэктару.

Сацыяльна-бытавы сэктар паступова ўкараняе **сацыялістычнае сумяшчальніцтва добраахвотнікаў.** Нежалькі добраахвотнікаў пасланы ў якасьці сталых прадстаўнікоў ЦСПСБ у савет інстытуту працы, у камісію па разглядзе заяў кандыдатаў у гэроі працы, у камісіі па чыстцы апарату Галоўсацтраху і Наркампрацы, у камісію па перарэгістрацыі наборных кніжак і г. д. Усе гэтыя добраахвотнікі спраўляюцца добра. Зараз сацыяльна-бытавы сэктар па ставіў перад прэзыдыумам ЦСПСБ пытаньне **аб вылучэньні з ліку добраахвотнікаў адказнага выканаўца сэктару і 3-х сацыялістычных намесьнікаў загадчыка сэктару.**

Правільныя і жывыя мэтады работы выклікаюць у добраахвотнікаў вялікую зацікаўленасьць пытаньнямі, якія стаяць перад сэктарам. Добраахвотнікі **ўжо не чакаюць выкліку.** Яны **прыходзяць самі,** просяць даць ім работу, даюць нарады, якую работу правесьці ў першую чаргу, інфармуюць аб сваіх уражаньнях ад работы розных устаноў, сталовак, каапэратываў, звоняць па тэлефоне — патрабуюць умяшаньня ЦСПСБ наконт тых ці іншых непарадкаў, жураўна наведваюць райбюро ЦРК, дапамагаюць ім працаваць, **перадаюць лепшы вопыт перадавых прадпрыемстваў.** Сацыяльна-бытавы сэктар арганізаваў экскурсію добраахвотнікаў у Маскву для азнаямленьня са сталовымі «АМО» і «Электропровода», адзін з добраахвотнікаў быў вылучан загадчыкам сталовай заводу імя Варашылава.

І, як натуральны вынік—назіраецца **рост колькасьці добраахвотнікаў.** Добраахвотнікі **самі вярбуюць актывістаў-ударнікаў.** Добраахвотнік тав. **Сандпер** (швейная фабрыка «Кастрычнік») завербаваў яшчэ 5 чалавек. Тав. **Зуеўсай** (завод імя Варашылава) завербаваў 3-х работніц. Адна з гэтых трох навічкоў ўжо завербавала 3-х прыцельніц.

Такім чынам, у сацыяльна-бытавога сэктару ёсьць чаму навучыцца. Здалося, чаго прасьцей — арганізаваць абмен вопытам, заслухаць інфармацыю сацыяльна-бытавога сэктару аб рабоце з добраахвотнікамі на прэзыдыуме ЦСПСБ. На жаль, гэтую інфармацыю прэзыдыум зьбіраецца слухаць на працягу **2-х месяцаў** і на кожным пасяджэньні прэзыдыуму знаходзяцца больш важныя пытаньні, а інфармацыя загадчыка сацыяльна-бытавога сэктару тав. **Беленькага** аб добраахвотніках пераносіцца на «наступнае пасяджэньне».

Загадчыкі сэктароў шукаюць «аб'ектыўную лазейку», каб выбрацца з няпрыемнага становішча. Такой «лазейкай» да апошніх дзён была быццам адсутнасьць партыйнай дырэктывы аб тым, каб добраахвотнікаў ЦСПСБ вызваляць на прадпрыемствах ад іншых грамадзкіх абавязкаў у перабоны час. Надта зьдзівіліся загадчыкі сэктароў, калі аўтар гэтых радкоў знайшоў у папцы добраахвотнікаў аргсэктару ЦСПСБ **пастанову менскага гаркому КП(б)Б ад 12-га студзеня 1931 году,** у якой прапануецца ўсім ячэйкам КП(б)Б **«вызваляць добраахвотнікаў, якія працуюць у ЦСПСБ, ад усякіх іншых нагрузак».** Аказалася, што аргсэктар, дабіўшыся гэтай пастановы, **не палічыў нават патрэбным паведаміць аб ёй іншыя сэктары.**

Так выконвае апарат ЦСПСБ дырэктыву XVI партзьезду аб уцягненьні «шырокіх рабочых мас у прафсаюзную работу» і больш рашучага «уцягненьня добраахвотнікаў у работу прафапарату» (з рэзалюцыі па дакладу тав. Швэрніка). **ПРАЎДЗІН.**

Аб рабоце Дамоў селяніна

(Пастанова ЦК УсеКП(б)

ЦК канстатуе, што Дамы селяніна не перабудавалі сваёй работы, не зьяўляюцца базамі масавай палітычнай агітацыі, культурнай работы і не выдуць вытворчай прапаганды па ўмацаваньні рэфту калгасаў.

Зусім нездавальняючая пастаноўка бытавога абслугоўваньня. У радзе месц Дамы селяніна скарыстаны для інтэрнатаў і іншых мэт, пры наяўнасьці фактаў ператварэньня іх у камэрцыйныя прадпрыемствы.

ЦК прапануе ўсім партарганізацыям і фракцыям выканкомаў забясьпечыць паляпшэньне становішча Дамоў селяніна і ператварыць іх у пункты агітацыйна-масавай і культурнай работы, разгарнуўшы ў іх вытворчую прапаганду за ўмацаваньне і рост калгасаў, лепшую арганізацыю працы і гаспадаркі і мабілізацыю мас на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам.

Абавязаць фракцыі ЦВК і выканкомаў: а) забясьпечыць пастаяннае кіраўніцтва работай Дамоў селяніна; б) арганізаваць у іх шырокую кансультацыю па пытаньнях арганізацыі працы і гаспадаркі ў калгасах, культурнага і савецкага будаўніцтва; в) прыцягнуць да штодзённай работы Дамоў селяніна земорганы, аддзелы выканкомаў і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі, прымацаваўшы для работы агранома, спэцыялістаў і арганізатараў асобных галін гаспадаркі.

У мэтах павышэньня пралетарскага ўплыву на работу Дамоў селяніна і ўстанаўленьня пастаяннай сувязі і зносін рабочых з прыяжджаючымі па лініі шэфства, перанясеньня вопыту арганізацыі працы і новых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва з прадпрыемства ў калгас — прыцягнуць да працы Дамоў селяніна шэфскія таварыствы.

Фракцыям выканкомаў забясьпечыць належную пастаноўку культурна-бытавога абслугоўваньня ў Дамах селяніна (інтэрнаты, мастацкая і друкаваная агітацыя, харчаваньне, станкі для копій), рашуча спыніўшы скарыстаньне Дамоў селяніна для іншых мэт.

Даручыць фракцыі ЦВК СССР распрацаваць мерапрыемствы па ўмацаваньні гаспадарча-арганізацыйнага становішча Дамоў селяніна, павышэньня якасьці іх працы і разгортваньня далейшага будаўніцтва, асабліва ў нацыянальных абласьцях.

Абавязаць Радыёцэнтр правесьці радыёфікацыю і Саюзкіно — кінофікацыю Дамоў селяніна.

Абавязаць фракцыі ЦВК СССР, абласкомаў, крайвыканомаў і ЦВК нац. рэспублік пэрыядычна заслухоўваць на пасяджэньнях прэзыдыуму даклады аб рабоце Дамоў селяніна.

Усім РК КП(б)Б

У выніку правядзеньня невыстарчальнай работы многімі райкомамі КП(б)Б па адборы ў лік «5000» набору ва ВТНУ, апошні (набор) знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б прапануе райкомам да 10-га красавіка г. г. скончыць адбор, строга прытрымліваючыся пастаноў ЦК УсеКП(б) і сакратарыяту ЦК КП(б)Б адносна партстажу і стажу кіруючай працы адабраных парттысячнікаў.

— Прапануецца калектывам і ячэйкам КП(б)Б, якім разасланы справаздачныя карткі для дасылкі ў ЦК вестак «аб кампраслойцы на прадпрыемстве» і саўгасе, тэрмінова гэтакія дасłаць у ЦК КП(б)Б

— **Дом Камасьветы.** 6-га красавіка ў 19 гадзін — даклад тав. Фэльдмана (кіраўніка Дзяржбанку) аб крэдытнай рэформе. Білеты для парт. і камсам. актыву ў гаркоме КП(б)Б і ў чытальні дому. У 19 гадзін — групавая кансультацыя для парапагандыстаў першапачатковых школ партасьветы і для вайсковых прапагандыстаў — «вынікі 6-га зьезду саветаў». Ад 19-21 гадз. — індывід. кансульт. на беларускай і ангельскай мовах.

— **ЦП Белпрацасьветы** прапануе ўсім беспрацоўным, якія знаходзяцца на вучоце пры ЦП і не прайшлі перарэгістрацыю ў красавіку гэтага году, зьявіцца ў ЦП (Дом працы, пакой № 13) не пазьней 9 красавіка ад 13 да 16 гадзін. Тыя, што не зьявяцца ў пакаданы тэрмін, будуць зьняты з вучоту і механічна выбываюць з саюзу.

Разгарнуць вярбоўку плытагонаў

Наркампрацы БССР, Лесбел і Беларускі камітэт лесдрэварабочых накіравалі ўсім сплаўканторам, рабочкомам лесдрэварабочых і інспэктарам працы райвыканкомаў наступную тэлеграму: «Вярбоўка рабочай сілы для сплаву праходзіць злачынна марудна. Пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў сплаўкантор, старшынь рабочкомаў і інспэктараў працы разгарнуць вярбоўку плытагонаў, правесьці кампанію замацаваньня лесарубаў для сплаву, скончыць заключэньне дагавораў з калгасамі. Інспэктарам працы аслабаніць плытагонаў ад усіх іншых работ. Сплаўканторам кожную пяцідзеньку тэлеграфна паведамляць аб колькасьці завербаваных плытагонаў, паасобна ад калгасаў.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

ГарКК і рэдакцыя газэты «Рабсельнор» напамінае ўсім таварышом, якія ўдзельнічалі ў «рэйдзе» па масавай праверцы стану і разгортваньня самакрытыкі і рэагаваньня, аб неабходнасьці тэрмінова здаць вынікі рэйду ў пісьмовай форме ў рэдакцыю газэты «Рабсельнор» (Савецкая вул., 63 другі паверх)
ГарКК.
Рэдакцыя газ. «Рабсельнор.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр Вішнёўс
СЁНЬНЯ адкрыты спэктакль „ПЕРШАЯ КОННАЯ“
Пачатак у 8 гадз. вечр.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Новы савецкі фільм драма „Госьць з Мэкі“ у 7 частках. Пачат. у 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“ — Сёньня кіно закрыта.

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Гістарычны фільм „Ледзяны дом“ Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары“ — Монці Бэнкс у лепш. камэдыі „Пятаючае шчасьце“ Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр“ — Другі тыдзень АБРЭК ЗАУР Кіно-аповесьць у 10 частках. Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня. Каса—з 11 г. 30 м.

КІНО „Спартак“ — З панядзелка, 6 красавіка мясцкі баявік „Другое жыцьцё“ Драма ў 8 частках. Пач.: 7 г., 9 г., і 10 г. 45 м. Каса—з 5 гадз.

Камісія ЦКК РСІ па ЧЫСТЦЫ Дзяржпляну
арганізуе сёньня, 6-га красавіка ў лекцыю Дзяржпляну
СУСТРЭЧУ прэзыдыуму Дзяржпляну, плянавых сакцый з плянавымі сэктарамі Наркаматаў, аб'яднаньняў і ведамстваў
па пытаньні аб выпуску плянавання ў БССР і ролі Дзяржпляну.
ЦКК РСІ абавязвае ўсіх плянавых працаўнікоў зьявіцца на гэтую нараду.
Запрашаюцца прадстаўнікі друку.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на аўтаманцёрна-гадзяленьне
школы дарбудаўчу Галоўдартраноу БССР
у гор. БАБРУЙСКУ.
У школу прымаюцца асобы абодвых родаў ад 16 да 19 год—дзеці рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднякоў, сярэднякоў, служачых і саматужнікаў з адукацыяй ня ніжэй 7-годкі.
Прыём заяў працягнецца да 15-га красавіка. Заявы пр